Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
12 САКАВІКА 2016 г. СУБОТА № 46 (28156) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пра што раскажа наша ДНК?

СТАР. 5



Французская рэтраспектыва

СТАР. 9



Павел Місько: пісьменнік вачамі дачкі

СТАР. 10

*ЛІЧБА ДНЯ*

**102,9 %**

*склаў індэкс спажывецкіх цэн у Беларусі на тавары і паслугі ў лютым у параўнанні са студзенем. Са снежнем 2015 года — 104,8 працэнта. Базавы індэкс спажывецкіх цэн, што выключаў змяненні цэн на асобныя тавары і паслугі, якія рэгулююцца дзяржавай, а таксама на тавары сезоннага характару, у лютым у параўнанні са студзенем склаў 101,6 працэнта, са снежнем 2015 года — 103,1 працэнта. Харчовыя тавары ў лютым падаражэлі на 2,1 працэнта ў параўнанні са студзенем і на 10,4 працэнта ў параўнанні з лютым 2015 года. Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 1,4 працэнта і 11 працэнтаў адпаведна.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20666,00 | ▼ |
| Еўра | 22984,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 294,04 | ▲ |
| Укр. грыўня | 799,85 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ПРАДЧУВАННЕ ЦЯПЛА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПЕРШАЯ СПРАВА — БЫЦЬ МАЦІ,

### або Ці варта шукаць шчасце ў рабоце?

**Ці варта павялічваць альбо памяншаць дэкрэтны водпуск? Як часта таты сыходзяць у водпуск па доглядзе дзіцяці? Ці дасягнута ў Беларусі гендарная роўнасць? У чым карысць і небяспека гламурных выданняў? Пра гэта і не толькі вядомыя беларускі ды іх калегі-мужчыны разважалі падчас «круглага стала» «Партрэт сучасніцы: беларуская жанчына сёння», арганізаванага Выдавецкім домам «Звязда».**

### МАТУЛЯ АЛЬБО КАЛЕГА?



Быць добрай маці і жонкай альбо рабіць кар'еру? Ці магчыма гэта сумясціць? На думку **Надзеі ЕРМАКОВАЙ, намесніка старшыні Беларускага саюза жанчын**, спалучаць гэтыя дзве іпастасі магчыма і нават карысна. Але варта разумець, што перш за ўсё — важна годна выхаваць дзяцей. «Дзяржавай робіцца ўсё магчымае, каб стварыць жанчыне ўмовы і для выхавання дзяцей, і для атрымання адукацыі, і для ўладкавання на тую працу, на якую яна сама жадае пайсці. Мяркую, што для жанчыны не самае галоўнае быць кіраўніком. Важна, каб праца была прыемнай для душы, такой, на якую раніцай хочацца ісці. І не менш важна быць каханай жонкай і добрай маці, — кажа Надзея Андрэеўна і дадае: — А быць бабуляй — яшчэ большае шчасце».



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«У Беларусі склаўся цудоўны вобраз жанчыны і ў медыяпрасторы, і ў дзяржаве», — выказваецца на тэму «круглага стала» **Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі.** — Пры гэтым кожная з жанчын павінна разумець, што і ад яе самой залежыць той самы абагульнены жаночы вобраз. Трэба быць удзячнай лёсу за тое, што ты нясеш па жыцці. І калі штосьці не атрымліваецца, варта перш за ўсё паглядзець, што яшчэ можна зрабіць для таго, каб твой вобраз і вобраз таго, хто побач, быў пазітыўным, больш прыгожым і карысным для іншых».

СТАР. 4

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ПРАЦА ГАЗЕТЫ МНОГАГА КАШТУЕ»



**Аляксандр СЯГОДНІК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы:**

— «Звязда» піша на самыя актуальныя тэмы, рэагуе на ўсе значныя падзеі ў краіне і свеце. Газета працуе і на перспектыву — рэгулярна выходзяць аналітычныя артыкулы, прысвечаныя эканамічнаму развіццю, міжнародным адносінам. Шмат увагі карэспандэнты надаюць асвятленню працы дэпутацкага корпуса — гэта прыемна.

Асабліва важна тое, што «Звязда» — беларускамоўнае выданне. Як слушна сказаў у свой час Францішак Багушэвіч, мова — адзенне душы. Газета робіць шмат для развіцця роднай мовы, і гэта многага каштуе. «Звязда» мае ўласныя традыцыі і прытрымліваецца іх. У той жа час выданне паспяхова выкарыстоўвае і наватарскія ідэі.

# АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ ДЗЯРЖАВЫ І ЦАРКВЫ

**ішла гаворка падчас сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Паўлам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі**

На сустрэчы ішла размова аб пытаннях, што датычацца ўзаемадзеяння дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы. Мітрапаліт Павел закрануў тэму будаўніцтва новага комплексу адміністрацыйных будынкаў для БПЦ на тэрыторыі, прылеглай да цяперашняга будынка Мінскай епархіі.

Прэзідэнт у цэлым пагадзіўся з ініцыятывай будаўніцтва, калі ўзнікла такая неабходнасць. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што паколькі прынялі рашэнне аб будаўніцтве такога духоўнага цэнтра, то праект павінен быць вытрыманы належным чынам і адпавядаць свайму прызначэнню. Плануецца, што для рэалізацыі праекта будзе створаны Царкоўны апякунскі савет, паведамляе БЕЛТА.

З улікам таго, што будаўніцтва зойме пэўны час, прапанавана на гэты перыяд для правядзення вялікіх мерапрыемстваў БПЦ выкарыстоўваць адзін з комплексаў у беларускай сталіцы. «У Мінску для гэтага хапае месцаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Ёсць яшчэ шэраг праблем, якія я гатовы абмяркаваць. Давайце падумаем аб тым, у якім напрамку будзем дзейнічаць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Падчас сустрэчы было закранута пытанне планаемай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі з членамі Сінода БПЦ.

# ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, падпісаўшы адпаведны ўказ, удастоіў высокіх дзяржаўных узнагарод работнікаў дзяржорганаў, прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў за высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Так, ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны памочнік кіраўніка спраў Прэзідэнта Уладзімір Скулавец.

Сярод удастоеных ордэна Пашаны намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Бузоўскі, памочнік Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі, член Беларускага грамадскага аб'яднання «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» Уладзімір Аляшкевіч, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда.

Медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны, у прыватнасці, намеснік старшыні Валожынскага райвыканкама Пётр Бібік, начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Каляда, дырэктар філіяла Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага страхавога прадпрыемства «Белдзяржстрах» па Гомельскай вобласці Мікалай Стош.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы прысвоіў ганаровае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь» сакратару Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалаю Лазавіку.

■ Бізнес

# Дэталёвы дыялог

**Дзяржава працягвае весці дыялог з прадпрымальнікамі па праблемных пытаннях гандлю. Зацікаўленыя бакі імкнуцца згладзіць прыватныя моманты, якія спросцяць выкананне ўжо прынятых законаў. З гэтай мэтай працягвае збірацца рабочая група па пытаннях дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў пры грамадска-кансультатыўным савеце па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве эканомікі. На гэтым тыдні адбылося чарговае пасяджэнне. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі саветаў індывідуальных прадпрымальнікаў гандлёвых цэнтраў і рынкаў, бізнес-саюзаў, а таксама дзяржаўных органаў.**

## Адзін тэрмінал на ўсіх

Міжведамасны каардынацыйны савет пры Нацыянальным банку прапануе дазволіць устаноўку і выкарыстанне аднаго плацежнага тэрмінала некалькімі ІП. Гэтае рашэнне прынята і мае на ўвазе ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у адпаведную пастанову Савета Міністраў і Нацыянальнага банка для забеспячэння магчымасці працы тэрміналаў у рамках тэхналогіі «мульцімерчант». Акрамя таго, савет пры Нацбанку прапанаваў Міністэрству гандлю рэкамендаваць прадпрымальнікам, што здаюць гандлёвыя плошчы за свой кошт, набываць, абслугоўваць і прадастаўляць арандатарам аплатныя тэрміналы. Што тычыцца пытання тарыфаў на эквайрынг (прыём да аплаты плацежных карт у якасці сродку аплаты тавару), то яны, на думку савета, павінны вырашацца на дагаворнай аснове.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Аляксандр СОТНІКАЎ** паведаміў, што прапановы рабочай групы па выніках мінулага пасяджэння былі прааналізаваныя Міжведамасным каардынацыйным саветам. Ва ўрад ужо накіраваны ліст з прапановай аб тым, каб дазволіць індывідуальным прадпрымальнікам, якія маюць некалькі гандлёвых пунктаў на адным гандлёвым аб'екце, выкарыстоўваць адзін плацежны тэрмінал.

Акрамя таго, Нацбанк прапаноўвае абавязаць ІП усталёўваць плацежны тэрмінал, калі іх сярэднямесячная выручка за папярэдні квартал перавышае 300 базавых велічынь. Пры гэтым пасля ўстаноўкі тэрмінала яго трэба будзе ў далейшым выкарыстоўваць незалежна ад аб'ёму выручкі. Таксама абмяркоўваецца прадастаўленне магчымасці індывідуальным прадпрымальнікам, што абавязаны ўсталяваць плацежны тэрмінал на працягу 2 месяцаў пасля наступлення такога абавязку, працаваць без яго, маючы на руках дакумент, які пацвярджае прыём банкам-эквайрам заяўкі на тэрмінал. Рабочая група па выніках адкрытага галасавання большасцю галасоў падтрымала гэтыя прапановы.

## Адказнасць падзеляць пароўну?

Таксама падчас сёмага пасяджэння рабочай групы абмяркоўвалася пытанне прымянення адміністрацыйнай адказнасці да індывідуальных прадпрымальнікаў за парушэнне тэхнічных рэгламентаў. **Намеснік старшыні Дзяржстандарта Сяргей ІЎЛЕЎ** паведаміў, што прапанова аб змяншэнні памераў адказнасці за парушэнне ТР знайшла сваё адлюстраванне ў праекце закона, які ўносіць змяненні і дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Згаданы законапраект падрыхтаваны Дзяржстандартам і знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У ходзе абмеркавання гэтага пытання ад удзельнікаў групы паступіла дадатковая прапанова аб падзеле меры адказнасці за парушэнне тэхнічных рэгламентаў паміж вытворцам, імпарцёрам і прадаўцом. Прадстаўнікі Дзяржстандарта выказалі гатоўнасць абмеркаваць гэтую прапанову 14 сакавіка ў вузкім складзе з прадстаўнікамі Беларускага саюза прадпрымальнікаў і іншымі экспертамі. Наступнае пасяджэнне рабочай групы па пытаннях дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў плануецца 18 сакавіка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** Kryzhevich@zviazda.by

### Тым часам

**Дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі Пётр АРУШАНЬЯНЦ** падчас прэс-канферэнцыі аб перспектыве развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва адзначыў, што штрафы для індывідуальных прадпрымальнікаў за гандаль таварамі без сертыфікатаў плануецца паменшыць. Зараз яны складаюць ад 200 да 500 базавых велічынь. У Міністэрстве эканомікі лічаць, што гэтая мінімальная штрафная планка занадта высокая для тых, хто робіць невялікія парушэнні, гандлюючы прадукцыяй легпрама. Міністэрства прапануе ніжнюю планку штрафаў паменшыць у 100 разоў, гэта значыць да 2 базавых велічынь. Таксама ёсць артыкулы, па якіх штрафныя санкцыі вылічваюцца ў 200% ад кошту незаконна ўвезенага тавару. Паводле слоў Пятра Арушаньянца, гэтую лічбу таксама плануецца знізіць у 2 разы.

# ПАДЗЕЯ, ЯКУЮ ЧАКАЛІ

**Ужо на пачатку лета плануецца адкрыць новы будынак Беларускага дзіцячага хоспіса, грашовыя сродкі на які збіралі ўсёй краінай.**

Будынак, размешчаны ў пасёлку Вопытны Мінскага раёна, будзе здадзены ў эксплуатацыю літаральна з дня на дзень, аднак напярэдадні яшчэ велізарная колькасць работы — неабходна дакупіць абсталяванне, упарадкаваць навакольную тэрыторыю і г.д. Паводле слоў **дырэктара грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» Ганны ГАРЧАКОВАЙ**, з 2011 года ўдалося сабраць нямала дабрачынных ахвяраванняў — больш за 36 млрд рублёў, у тым ліку 21 млрд — ад юрыдычных асоб, 7 млрд — ад фізічных, паступала і замежная дапамога — з Англіі і Швейцарыі. Пачалося будаўніцтва ў 2014-м, а сёння на ўскрайку пасёлка можна бачыць гатовыя будынкі, дзе фактычна зроблена аддзелка, да якіх падведзены сеткі і камунікацыі. Новы дзіцячы хоспіс — гэта стацыянар на 10 ложкаў, рэабілітацыйны і адукацыйны цэнтры, невялічкая гасцініца для бацькоў, капліца. Праектаваць незвычайны будынак дапамаглі англічане, якія прадугледзелі спецыфіку работы падобнай установы. Кожная палата разлічана на адно дзіця, мае асобны выхад на вуліцу, у пакоях прадугледжана спецыяльная сістэма пад'ёмнікаў для ляжачых хворых.

Частка неабходнага абсталявання закуплена і змантавана, аднак гэта яшчэ далёка не ўсё, што патрабуецца. Таму зараз стартуюць мерапрыемствы па зборы сродкаў на аснашчэнне новага будынка.

**Святлана ПРОТАС.** protas@zviazda.by

■ Факт

# УНЁСАК АРМІІ Ў АХОВУ ЛЕСУ

**Міністэрства абароны перадае ў аператыўнае ўпраўленне Міністэрства лясной гаспадаркі 20 гусенічных транспарцёраў. Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №39рп ад 10 сакавіка гэтага года.**

— Такая спецыялізаваная тэхніка проста неабходная лесаводам краіны для тушэння лясных пажараў на цяжкадаступных участках, — распавялі ў прэсслужбе Мінлясгаса. — Падобныя машыны ўжо паспелі добра сябе зарэкамендаваць на тушэнні пажараў у Палескім лясгасе.

Цягам шасці месяцаў гэтыя транспарцёры паступяць на ўсе аб'яднанні. І хоць асноўны ўпор будзе зроблены на паўднёвыя рэгіёны — лясгасы Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей, у цэлым мяркуецца закрыць усе патрэбы ўсіх лясгасаў, дзе ёсць цяжкадаступныя ўчасткі, балоты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ Тры пытанні да ўлады

# ГОД КУЛЬТУРЫ ПАЧАЛІ З НАТХНЕННЕМ

## У Магілёве складуць песню да 750-годдзя горада

**Міжнародныя фестывалі «М@рт.кантакт», «Залаты шлягер», «Магутны Божа» ўжо даўно сталі візіткай Магілёва. Сёлета ён прымае ўдзельнікаў III нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі». У горадзе абмяркоўваюцца ідэі стварэння сучасных канцэртных пляцовак і аднаўлення гістарычнай часткі. Пра тое, якія падзеі будуць адбывацца ў культурным жыцці горада ў найбліжэйшы час і што чакаць у перспектыве, размова са старшынёй Магілёўскага гарвыканкама Уладзімірам ЦУМАРАВЫМ.**

***— З 2013 года ў Магілёве вядзецца маштабная рэканструкцыя мастацкага музея Бялыніцкага-Бірулі па вуліцы Ленінскай. Праектам прадугледжаны капітальны рамонт будынка, установка сучаснага мультымедыйнага абсталявання, сістэмы клімат-кантролю. Магілёўчане з нецярпеннем чакаюць адкрыцця гэтага музея і вельмі хваляюцца, што рэканструкцыя можа зацягнуцца. Апошні раз агучвалася, што яна завершыцца ў 2016 годзе. Наколькі рэальна, што адкрыццё ўсё ж такі адбудзецца?***

— Міністэрствам культуры прадугледжана выдзяленне 15 мільярдаў рублёў для завяршэння рэканструкцыі гэтага аб'екта. Але для таго, каб зрабіць усе неабходныя работы, трэба яшчэ каля 5 мільярдаў рублёў. У размове з міністрам Барысам Святловым ішла гаворка пра тое, што гарвыканкам гатовы ўзяць на сябе ролю арганізатара работ, звязаных з рамонтам гэтага будынка. За кошт горада будзе зроблена добраўпарадкаванне вуліцы Ленінскай, дзе знаходзіцца музей. Але трэба яшчэ знайсці фінансы, каб прывесці ў парадак тэрыторыю, якая прылягае непасрэдна да музея. У найбліжэйшы час на ўзроўні міністра культуры, абласных і гарадскіх улад мы канчаткова вызначымся з планам нашых далейшых дзеянняў.

***— Нядаўна ў гарвыканкаме былі прадстаўлены архітэктурны план развіцця Магілёва, у тым ліку па аднаўленні яго гістарычнай часткі. Як гэта будзе рэалізоўвацца?***

— Будуць працягвацца работы па аднаўленні паркавай зоны ў Падміколлі, на гэты аб'ект ужо ёсць праектна-каштарысная дакументацыя. Маецца рашэнне гарвыканкама па аднаўленні Свята-Пакроўскай царквы і ўзвядзенні комплексу будынкаў. Пакуль падмуркі закансерваваны і распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя. Заказчыкам праекта выступае Свята-Мікольскі жаночы манастыр. Мы спадзяёмся, што запланаванае будзе зроблена, але тут усё залежыць ад фінансавых магчымасцяў. У ходзе рэканструкцыі Пушкінскага моста мы выявілі падмурак яшчэ адной царквы. І цяпер разглядаем пытанне, каб захаваць і яго. У гэтым зацікаўлены і нашы вучоныя-гісторыкі з МДУ імя Куляшова.

***— Гэты год праходзіць пад знакам культуры. Даўно вядзецца размова пра тое, што гораду не хапае сучасных пляцовак, узровень якіх мог бы дазволіць праводзіць мерапрыемствы найвышэйшага класа. Якія шанцы ў магілёўчан атрымаць такі падарунак?***

— Сапраўды, Магілёву не хапае добрага канцэртнага комплексу. Дэталёвым планам развіцця Магілёва прадугледжана размяшчэнне канцэртнай залы па праспекце Міру ў раёне вуліцы Курганскай — насупраць адміністрацыі Ленінскага раёна. Яшчэ адна пляцоўка, якую мы разглядаем, — база лучнікаў. Але спачатку трэба знайсці падыходзячае памяшканне для спартсменаў. Нядрэнная магла б стаць і пляцоўка ў раёне слаламнай трасы. Варыянты ёсць, трэба толькі вызначыцца. А пасля, як бы там ні было складана, паэтапна пачнём вырабляць праектна-каштарысную дакументацыю.

Ёсць таксама эскізнае рашэнне па будаўніцтве сучаснага культурна-дзелавога гандлёвага цэнтра на пляцоўцы ў Падміколлі, непадалёк ад вуліцы Вялікая Цывільная. Ім прадугледжана ўзвядзенне цэнтральнай лесвіцы, каб жыхарам горада і яго гасцям было зручна спусціцца да гэтага цэнтра прама з плошчы Арджанікідзэ. Але гэта прапанова пакуль знаходзіцца на ўзгадненні з Міністэрствам культуры.

Зараз насупраць гарвыканкама на вуліцы Лепяшынскага вядзецца будаўніцтва культурна-дзелавога цэнтра, дзе плануецца праводзіць сур'ёзныя мерапрыемствы накшталт бізнес-форумаў. Пакуль цяжка сказаць, зможам мы там ладзіць нейкія канцэртныя мерапрыемствы або не. Праектна-каштарысная дакументацыя яшчэ ў распрацоўцы.

Але ў магілёўчан ёсць добрая магчымасць прыемна правесці час і на ранейшых пляцоўках. Сёлетні год будзе вельмі багаты на культурныя падзеі. Асаблівы акцэнт зробім на 75-годдзі абароны Магілёва. Плануецца правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных 95-годдзю Івана Шамякіна, 125-годдзю Максіма Багдановіча. Пройдуць розныя творчыя сустрэчы, форумы і гэтак далей. У рамках падрыхтоўкі горада да 750-годдзя, якое мы адзначым у наступным годзе, сёлета будзе аб'яўлены конкурс на найлепшую песню пра горад. Традыцыйна ў рамках святкавання Дня горада пройдзе карнавальнае шэсце і адбудзецца свята нацыянальных культур.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

■ Экспартны патэнцыял

# НОВАЯ ПРЫСТУПКА «ВЯЛІКАГА КАМЕНЯ»

## Кампанія па развіцці Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парку ўступіла ў Сусветную арганізацыю свабодных эканамічных зон (СЭЗ)



**Такім чынам, «Вялікі камень» выходзіць на міжнародны ўзровень ужо на стартавым этапе свайго развіцця. Адразу пасля цырымоніі падпісання адпаведнага дакумента генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» Лі ХАЙСІНЬ адзначыў, што стаўшы членам Сусветнай арганізацыі СЭЗ, эксперты кампаніі змогуць вывучыць іншыя мадэлі свабодных эканамічных зон, абменьвацца вопытам, а таксама ў больш шырокім фармаце прадстаўляць магчымасці і перспектывы развіцця парка на міжнароднай арэне.**

Увогуле, на тэрыторыі парка плануецца стварэнне інтэрнацыянальнай прасторы, раскрывае карты Лі Хайсінь: «Мы спадзяёмся прыцягнуць інвестараў з усяго свету, актыўна наладжваем супрацоўніцтва з іншымі краінамі. Цяпер да нашага парка назіраецца сур'ёзная зацікаўленасць з боку буйных прадпрыемстваў Германіі, Польшчы, Літвы і Сінгапура».

### ПАДТРЫМКА ДЗЯРЖАВЫ

**Намеснік міністра эканомікі Беларусі Аляксандр ЯРАШЭНКА** разлічвае на прадуктыўнае супрацоўніцтва з Сусветнай арганізацыяй СЭЗ і лічыць, што самае галоўнае — вывесці нашы прэферэнцыйныя тэрыторыі, перш за ўсё парк «Вялікі камень», на міжнародную арбіту ўзаемадзеяння. «У Сусветнай арганізацыі свабодных эканамічных зон сканцэнтраваны ўсе прадпрыемствы СЭЗ. Мы б хацелі ў гэтую міжнародную супольнасць ўкараніцца», — адзначыў ён.

**Разглядаецца прапанова вызваліць такія кампаніі СЭЗ тэрмінам на тры гады ад аплаты падатку на нерухомасць з моманту рэгістрацыі.**

А яшчэ Аляксандр Ярашэнка адзначыў, што Міністэрства эканомікі ў якасці каардынатара галоўных напрамкаў развіцця СЭЗ арыентуецца на тое, каб максімальна поўна выкарыстоўваць міжнародны вопыт. «Сёння мы падрабязна абмяркоўвалі гэтую тэму. Потым прыйшлі да высновы, што ўзровень прэферэнцый важны, але не менш важна падтрымліваць на неабходным узроўні якасць аказваемых паслуг на такіх тэрыторыях. Таму прынцып аднаго акна тут з'яўляецца абавязковым», — падкрэсліў намеснік міністра. Пры гэтым Аляксандр Ярашэнка дадаў, што беларускім спецыялістам прапанавана прайсці навучанне ў Сусветнай арганізацыі СЭЗ.

У сваю чаргу выканаўчы **дырэктар Сусветнай арганізацыі свабодных эканамічных зон доктар Самір АМРУНІ** асноўнай мэтай такога супрацоўніцтва назваў стварэнне платформы для ўсіх СЭЗ, каб можна было абменьвацца вопытам і ведамі. «У нас ёсць тры віды членства: члены, якія маюць права голасу, гэта — свабодныя эканамічныя зоны, асацыятыўныя члены — эксперты, якія працуюць у дадзенай галіне, і назіральнікі — міністэрствы краін, якія падтрымліваюць СЭЗ. Міністэрства эканомікі Беларусі пацвердзіла сёння, што з'яўляецца актыўным назіральнікам», — удакладніў сваю пазіцыю доктар Амруні.

### НОВЫЯ ЛЬГОТЫ ДЛЯ РЭЗІДЭНТАЎ

Між іншым, Мінэканомікі Беларусі разглядае магчымасць стварэння сёлета шэрагу дадатковых ільгот і прэферэнцый для рэзідэнтаў СЭЗ. «Гэта, зразумела, дыскусійнае пытанне, але стварэнне падобных плюсоў на тэрыторыі адпаведных зон дало б магчымасць ім мець сапраўды выгадныя ўмовы для вядзення бізнесу ў нашай краіне», — падаміў Аляксандр Ярашэнка.

Неабходнасць у такіх напрацоўках сапраўды існуе. Справа ў тым, што ў адпаведнасці з нашымі міжнароднымі дагаворамі ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза рэзідэнты беларускіх СЭЗ з 1 студзеня 2017 года не будуць валодаць тымі мытнымі прэферэнцыямі, якімі яны валодаюць цяпер. Таму ўжо летась эксперты міністэрства паспрабавалі «адшукаць» нейкія дадатковыя льготы рэзідэнтам СЭЗ дзеля таго, каб аблегчыць ім будучы перыяд уступлення ў новыя ўмовы.

Пасля спецыялісты ўнеслі пэўныя змены ў падатковы кодэкс. Тут гаворка ідзе аб павелічэнні з 1 студзеня 2017 года да дзесяці гадоў перыяду вызвалення арганізацый ад аплаты падатку на прыбытак пры ўмове пастаўкі іх прадукцыі на экспарт. Раней гэты перыяд складаў 5 гадоў. Намеснік міністра адзначыў, што таксама разглядаецца прапанова вызваліць такія кампаніі СЭЗ тэрмінам на тры гады ад аплаты падатку на нерухомасць з моманту рэгістрацыі.

### ПАШЫРАЦЬ ДВУХБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Саветнік па гандлёва-эканамічных пытаннях пасольства КНР у Беларусі Лю СЮЭСУН**, які прысутнічаў на мерапрыемстве, паведаміў карэспандэнту «Звязды», што летась тавары гандлёвы абарот паміж нашымі краінамі дасягнуў 3,182 млрд долараў у эквіваленце і склаў больш за 5,5% ад агульнага аб'ёму таварнага гандлю з замежнымі краінамі. За год беларускі экспарт тавараў у Кітай павялічыўся на 22,1% і склаў 0,78 млрд долараў. Імпарт у нашу краіну з Кітая таксама павялічыўся і дасягнуў аб'ёму на суму 2,4 млрд долараў. У выніку Кітай для Беларусі з'яўляецца сёння трэцім сусветным гандлёвым партнёрам і першым — у азіяцкім рэгіёне.

Саветнік Лю Сюэсун адзначыў, што цяпер кітайскі бок усяляк заахвочвае свае прадпрыемствы па пашырэнні імпарту беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі і пастаянна садзейнічае выраўноўванню гандлёвага балансу паміж дзвюма краінамі. Так, прадстаўнік пасольства паведаміў, што сёння распачаты мерапрыемствы па сертыфікацыі сельскагаспадарчай прадукцыі для паставак у Кітай. Напрыклад, цяпер 15 малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў краіны ўжо атрымалі ліцэнзіі на экспарт сваёй прадукцыі ў Кітай. Больш за тое, сёння кітайскія кампаніі спадзяюцца і чакаюць, што беларускія прадпрыемствы правядуць сур'ёзныя рэкламныя мерапрыемствы па прэзентацыі сваёй прадукцыі, зробяць яе пазнавальнай і папулярнай на рынках іх краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Меркаванні

# ПАДЫХОДЗІЦЬ ПЛАЎНА, УЛІЧВАЦЬ НЮАНСЫ

**Пасля нарады ў Прэзідэнта пытанні развіцця пенсійнай сістэмы зноў пачалі шырока абмяркоўваць. Тым больш што сталі вядомы магчымыя варыянты павышэння пенсійнага ўзросту і тэрміны, за якія гэта плануецца зрабіць. Хутчэй за ўсё, рэформа пачнецца ўжо ў наступным годзе. Што з гэтай нагоды думаюць спецыялісты і грамадскасць?**

**Наталля МУРАШКЕВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

— Мы не можам сёння абысці пытанне павышэння пенсійнага ўзросту. Задача сацыяльнай дзяржавы — гарантаваць своечасовасць і паўнату выплаты пенсій. Сярэдні памер пенсіі і, адпаведна, дабрабыт пажылых людзей мусіць расці. Ва ўмовах неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі, абумоўленай узмацненнем працэсу старэння насельніцтва на фоне змяншэння яго колькасці, нельга дапусціць разбалансіроўкі пенсійнай сістэмы. На нарадзе ў кіраўніка дзяржавы было адзначана, што мы не можам змяншаць памеры пенсій. Мы таксама не можам падняць тарыфы адлічэнняў на пенсійнае страхаванне, бо тым самым павялічым эканамічную нагрузку на работнікаў і працадаўцаў.

Лічу, што для захавання стабільнага функцыянавання пенсійнай сістэмы неабходна зрабіць прымальныя для дзяржавы і яе насельніцтва захады. На пасяджэнні былі прапанаваны і абмеркаваны варыянты павышэння пенсійнага ўзросту. Канчатковае ж рашэнне па дадзеным пытанні будзе прынята з улікам меркавання нашага грамадства.

**Ларыса БАГДАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па працы і сацыяльных пытаннях:**

— Сярод нашага насельніцтва абмеркаванне павышэння пенсійнага ўзросту вядзецца даўно, і мы неаднаразова казалі пра яго неабходнасць. Нягледзячы на тое, што Прэзідэнт на нарадзе казаў, што калі можна пацярпець, то трэба цярпець, але, на думку эканамістаў, «праводзіць рэформу трэба было яшчэ ўчора». Думаю, падчас яе правядзення будзе ўлічаны вопыт Казахстана па павышэнні пенсійнага ўзросту на 3 гады, бо зараз яны таксама стаяць перад дылемай, павышаць яго далей альбо не, бо патрэбны эканамічны эфект не быў да канца дасягнуты. Лічыцца, што самы эканамічна мэтазгодны, аптымальны тэрмін павышэння — 5 гадоў. Напэўна, на гэта і варта адразу ісці, каб не рабіць пазней лішнія крокі. Увогуле я за тое, каб змены такога кшталту праводзіліся паступова.

Я сама на пенсіі і лічу, што гэта добрая мера, не супраць таго, каб працаваць даўжэй. Па прафесіі я доктар, і гэта праца, як і дэпутацкая, мне даспадобы. Калі шчыра, то вельмі здзіўляюся, чаму часам пенсіянеры маюць штосьці супраць павышэння. Бо гэта, перш за ўсё, становіцца паўплываае на памер іх пенсіі. Тыя ж, каму яшчэ прыйдзецца працаваць, могуць і мець штосьці супраць, згодна. Але цяпер абавязкова трэба тлумачыць і ім, і ўсяму грамадству, якія нас чакаюць плюсы і наступствы з гэтай нагоды. Па вялікім рахунку, толькі тыя пенсіянеры, якія яшчэ працуюць, згубяць магчымасць адначасова атрымліваць і пенсію, і зарплату. Так, яны ад гэтага крыху пацерпяць, але затое эканамічна ўмацуецца краіна.

**Вячаслаў САЛАВЕЙ, намеснік старшыні Брэсцкага абласнога аб'яднання прафсаюзаў:**

— Пра неабходнасць павышэння пенсійнага ўзросту пачалі казаць яшчэ 10 гадоў таму. Але ўсё адкладалі: маўляў, пачакаем, не гатовы яшчэ. І ўсё роўна вярнуліся да гэтай ідэі. Мне здаецца, найбольш аптымальны варыянт — пенсійны ўзрост жанчынам зрабіць 60 гадоў, а мужчынам — 63. З улікам цяперашняй дэмаграфічнай сітуацыі гэта было б правільна. Але невялікую розніцу паміж крытэрыямі для жанчын і мужчын захаваць трэба. Таму што жанчына мусіць яшчэ і дома пабыць, унукаў дагледзець. Мы павінны берагчы нашых дам. Разам з тым трэба да кожнай прафесіі падысці асобна, бо не ўсюды чалавек у пажылым узросце можа эфектыўна працаваць. Напрыклад, на той жа будоўлі паспрабуй ты па паверхах пабегаць. Ці тралейбусам кіраваць. Я жанчыне ў 60 гэтую справу не даверыў бы. Прымаючы рашэнне аб павышэнні пенсійнага ўзросту, варта прапрацаваць гэтыя нюансы.

**Аляксандр ГЛУХОЎЧАНКА, пенсіянер, працуе інжынерам:**

— Складана сказаць, ці можа чалавек у 65 гадоў працягваць працаваць. Усё вельмі індывідуальна, залежыць ад стану здароўя, шкоднасці работы. Адзін яшчэ 10-20 гадоў гатовы пасля пенсіі адпрацаваць, а іншы ледзь дацягвае да гэтага ўзросту. У мяне многія знаёмыя пенсіянеры працягваюць хадзіць на работу, але гэта прафесіі не шкодныя і не фізічна цяжкія. Звычайна інтэлектуальная праца. Тое, што павышэнне пенсійнага ўзросту мусіць быць плаўным, — гэта адназначна. Бо адразу перайсці на новыя ўмовы будзе псіхалагічна цяжка. Але якімі крокамі гэта лепш рабіць, па шэсць, па восем месяцаў, не ведаю. Няхай ужо спецыялісты вырашаюць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# НАША ПЕРАМОГА

## Ігнат Галавацюк стаў найлепшым на юніёрскім чэмпіянаце свету па канькабежным спорце



**Турнір стартаваў учора ў кітайскім Чанчуні, ён пачаўся з розыгрышаў медалёў у спрынце на 500 м сярод юнакоў. Залаты медаль на гэтай дыстанцыі заваяваў прадстаўнік нашай краіны, разам з тым Ігнат усталяваў новы рэкорд Беларусі, ён паказаў час 35,72 секунды. Асноўныя канкурэнты нашага спартсмена ў спрынце выступалі пасля яго, але ні канадзец Крыстафер Фіёла, які заняў другое месца, ні кітаец Таа Янг (трэцяе месца), не змаглі палепшыць вынік Ігната.**

Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў канькабежца з заваяваннем «золата». «Табе пакарылася важная для нашай краіны вяршыня. Гэты медаль і апошнія вынікі юніёрскай каманды даюць балельшчыкам надзею на адраджэнне ў Беларусі слаўных традыцый канькабежнага спорту», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка таксама падзякаваў трэнерам і членам каманды. «Шчыра жадаю ўсім вам моцнага здароўя, шчасця і выдатных перамог на лядовых дарожках свету!» — пажадаў Прэзідэнт.

Адзначым, за некалькі дзён перад тым Ігнат Галавацюк заваяваў «серабро» на юніёрскім этапе Кубка свету.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*


## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТРАНСБУГ»

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Объекты недвижимости: Капитальное строение (инв. №100/С-342), общ. пл. 1127,7 м² – административное здание, инв. №0001; Капитальное строение (инв. №100/С-343), общ. пл. 718 м² – «Бытовой корпус», инв. №0004; Капитальное строение (инв. №100/С-344), общ. пл. 2462,7 м² – «Ремонтно-механическая мастерская», инв. №0002; Капитальное строение (инв. №100/С-345), общ. пл. 72,1 м² – контрольно-пропускной пункт, инв. №0005; Капитальное строение (инв. №100/С-347), общ. пл. 602,5 м² – «Механизированная мойка», инв. №0009; Капитальное строение (инв. №100/С-346), общ. пл. 1729,5 м² – Здание склада, инв. №0006; Туалет кирпичный, инв. №0059; Водопровод мех. мастерской, инв. 00073; Водопровод административного здания, инв. №00074; Канализация фекальная мех. мастерской, инв. №00072; Теплотрасса подземная, инв. №00075; Сети водопроводные (гидрант), инв. №70163; Телефонизация, инв. №00050; Низковольтные сети наружного освещения, инв. №00070; Дорога производственная автомобильная, общ. пл. 18844,08 м², инв. №49; Ж/б ограждение, протяж. 291,834 м.п., инв. №48; Калитка, инв. №70039; Ворота, инв. №70040; Ворота, инв. №70041; Ограждение, пл. 14,85 м², инв. №70042; Очистные отстойники, инв. №99.<br>Имущество: Вентилятор агрегатный Н359, инв. №194; вентилятор ВЦ 4-70, инв. №366; вентилятор ВЦ 4-70 инв. №367; кран-балка, инв. №147; кран-балка 5,1 мм, инв. №210; электроталь ГП-1, инв. №250; кран опорный 3-т 10,5м, инв. №324; кран-балка КР 453, инв. №397; кран-балка 3,2 т ТДЛ-10,8 м, инв. №414; подъемники ПТО-16А, инв. №265; подъемники ПТО-16А инв. №266; подъемники ПК-8, инв. №359; подъемники ПК-8 инв. №360; подъемники ПК-8 инв. №361; подъемник ПТО-39, инв. №372; подъемники ПК-8, инв. №398; подъемники ПК-8 инв. №399; подъемники ПК-8 инв. №407; подъемник П-150, инв. №408; стенд для разборки и сборки двигателя, инв. №27902; вентилятор радиальный Ц-4-70-12,5, инв. №195; вентилятор радиальный Ц-4-70-12,5 инв. №196; вентилятор радиальный Ц-4-70-12,5 инв. №197; вентиляционная установка, инв. №198; шлагбаум, инв. №70043; теплосчетчик ТЭН-05, инв. №691 | 12 021 277 000 | 601 063 850 |

| | |
|---|---|
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114/2 |
| Характеристики замельного участка | Для обслуживания капитального строения (инв. №100/С-342), общ. пл. 1127,7 м² – земельный участок пл. 0,0768 га с кадастровым номером 140100000001028145; Для обслуживания прочих объектов – земельный участок 2,3212 га с кадастровым номером 140100000001008553 |
| Условия продажи | Без условий |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Трансбуг» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 25 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029)-626-72-52.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 24 марта 2016 г. до 17.00.**
**Контактные телефоны организатора аукционных торгов: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

# ПЕРШАЯ СПРАВА — БЫЦЬ МАЦІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Такога ж класічнага бачання ролі жанчыны прытрымліваецца і **Святлана САРОКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, дырэктар «Палаца культуры горада Маладзечна»**.



На яе думку, жанчына спрадвеку была ўвасабленнем абаяльнасці, прыгажосці, захавальніцай хатняга ачага, сямейнага дабрабыту і ў той жа час заставалася надзейнай падтрымкай для мужчыны. А працуючы ў калектывах, яна стварае здаровы клімат і стымулюе мужчын на праяўленне найлепшых якасцяў. Але ўсё ж такі галоўная місія кожнай з нас — даць жыццё дзіцяці, выгадаваць яго, выхаваць дастойным чалавекам, лічыць сенатарка. «Мы з вамі такія разумныя, ініцыятыўныя, крэатыўныя, інтэлектуальныя імкнёмся быць паспяховымі ў сваёй справе, у прафесіі. І што цудоўна, спалучаем усё гэта з выхаваннем дзяцей», — дадае Святлана Рыгораўна.

## БЫЦЬ ТВОРЦАМ НЕ ЗАБАРОНІШ

Быць добрай матуляй, безумоўна, важна. А як жа высокія мэты па ўдасканаленні навакольнага свету і змяненні яго ў лепшы бок? Увогуле, ці атрымлівалася гэта рабіць беларускам некалькі стагоддзяў таму? **Людміла РУБЛЕЎСКАЯ, пісьменніца і аглядальнік газеты «СБ. Беларусь сегодня»**, рых-



туючы чарговы матэрыял рубрыкі «Трыялет», у якой яна расказвае пра творчых паспяховых жанчын, прапанавала ўспомніць імёны беларусак, якія ўвайшлі ў гісторыю. Першае, што прыйшло ў галаву — Цётка, Ефрасіння Полацкая... «І мы задумаліся, што, відаць, не хапае нам вобраза не толькі сучаснай жанчыны, але і вобраза жанчыны ў гісторыі, якія былі сапраўднымі дзеячамі, а не стаялі ў цені падзей. І тады сталі ўспамінаць: Рагнеда, Анастасія Слуцкая, Барбара Радзівіл. Яны ёсць! Значыць, беларускую жаночую гісторыя яшчэ трэба «выцягваць», — заўважыла пісьменніца.

Людміла Рублеўская прызналася, што, калі пісала свае гістарычныя раманы, перачытала шмат архіўных дакументаў і цяпер можа дакладна сказаць: за кожнай палітычнай падзеяй стаіць жанчына, якой часта даводзілася заставацца «шэрым кардыналам». А ў нашы дні ў розныя сферы, і ў беларускую літаратуру таксама, прыходзіць шмат жанчын-творцаў. Што далёка шукаць: першы беларускі нобелеўскі лаўрэат Святлана Алексіевіч — пісьменніца.



**Алесь БАДАК, пісьменнік і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»**, прызнаецца, што не дзеліць сучасную прозу на жаночую і мужчынскую і ўпэўнівае, што правы ў сучасных жанчын такія ж, як і ў супрацьлеглага полу. «Цяпер жанчыны, калі разглядаць творчых асоб, займаюць такія пасады, якія на працягу ўсяго мінулага стагоддзя лічыліся мужчынскімі. Галоўныя рэдактары часопіса «Маладосць», газеты «Літаратура і мастацтва», гумарыстычнага часопіса «Вожык» — усе жанчыны. Калі кажам пра літаратуру — тое ж самае. Людміла Рублеўская, Алена Брава... Ці жаночая ў іх проза? Не. У іх перш за ўсё якасная, цікавая проза», — лічыць Алесь Бадак.

**Ірына АКСЮЧЫЦ, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**, ужо



больш за дзесяціГоддзе вывучае псіхалогію поспеху. Яна лічыць, што менавіта для жанчын, якія імкнуцца дасягнуць пастаўленых мэтаў у прафесіі і творчасці, гэтая навука цяпер асабліва актуальная. Існуе сусветная практыка, калі побач з паспяховымі людзьмі ёсць настаўнік, які ў складаных сітуацыях дапамагае адшукаць новыя стратэгіі, бо не заўсёды наша пабытавая мудрасць зможа быць карыснай у справах прафесійных. У гэтым плане псіхалогія поспеху мае ў сваім арсенале ўніверсальныя і больш дасканалыя інструменты. Менавіта пра іх расказвае псіхолаг у сваёй рубрыцы на старонках часопіса «Алеся».

Член Савета Рэспублікі Святлана Сарока пацвярджае гэтую думку: «Праводзячы шмат мерапрыемстваў у сваёй установе, я запрашаю псіхолагаў. І яны прызналіся, што калі іх клікалі гады тры таму, то прапаноўвалі прачытаць лекцыі аб сямейных каштоўнасцях, а апошнім часам — пра поспех, лідарства, кар'еру жанчыны». Мяняецца час, мяняемся мы.

## ПРЫСУД ГЛАМУРНЫМ ЧАСОПІСАМ

І што мусіць чытаць такая дасканалая па ўсім лэдзі? Якім мусіць быць ідэальнае выданне для яе? Літаратар Алесь Бадак прызнаўся, што пабойваецца гламурных часопісаў і лічыць, што яны могуць нашкодзіць жанчыне. «Гэта як лялька Барбі. Яна прыгожая, але кожнай дзяўчынцы хочацца быць падобнай на гэты ідэал. Гэта можа быць вельмі небяспечна, бо не кожная здольная стаць, напрыклад, моднай спявачкай, вобраз якой дэманструюць масавыя глянцавыя жаночыя выданні. А гэта ж велізэзная праца». А Людміла Рублеўская іранічна заўважае, што нельга прымусіць кожную асобу слабага полу чытаць філасофскія трактаты, але прывіваць добры густ беларускам — задача дасягальная. І значную ролю ў гэтым адыгрывае часопіс «Алеся».

— Колькі тут прыгожых гераінь, колькі лёсаў, колькі цікавай карыснай інфармацыі, — кажа Лілія Ананіч, гартаючы часопіс жанчын Беларусі. — Разам з тым не толькі «Алеся», але і іншыя нацыянальныя сродкі масавай інфармацыі не падзяляюць грамадства на жанчын і мужчын, а мы ў цэлым кажам, што адбываецца ў літаратуры, эканоміцы, медыцыне. Мы кажам пра тое, як Беларусь стварае сваё «сёння», як будуе сваю будучыню. І жанчыны ў гэтым адыгрываюць значную ролю.

На погляд **Зінаіды МАНДРОЎСКАЙ, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях**, станоўчая роля жанчы-



ны, якая адлюстроўваецца ў прэсе, адпавядае таму, якую ролю жанчына займае ў грамадстве. Чаму так адбылося? Бо мужчыны ў свой час далі магчымасць, трошкі саступілі месца. Ды і самі жанчыны сталі імкнуцца быць карыснымі ва ўсім, да чаго яны прызваныя самой прыродай: грамадству, сям'і, марам... «Для мяне важна, каб мы прыйшлі ў гэты свет і бачылі перад сабой мэту і ішлі наперад, спасцігаючы яго. Стваральная сіла ў жанчыне зараз прачнулася настолькі, што мы здольныя працаваць на адным узроўні з мужчынамі. А яны, на шчасце, нам у гэтым не перашкаджаюць», — усміхаецца дэпутат.

## ЧАМУ ТАТЫ НЕ ІДУЦЬ У ДЭКРЭТ?

— Мая папярэдніца, славутая рэдактар «Алесі» Марыя Карпенка, расказвала, што ў свой час дэкрэтны водпуск быў усяго гадпаўтара, — расказвае **Ларыса РАКОЎСКАЯ, цяперашні галоўны рэдактар часопіса.** — І яна



бачыла па сваёй дачцэ, што гэта зусім маленькі тэрмін для таго, каб дзіця адпусціла жанчыну на працу. Гэтая тэма не раз абмяркоўвалася на старонках выдання. А тады часопіс «Работніца і сялянка» (сённяшняя «Алеся») быў трэндавым, вядомым па ўсім СССР, накладам у 1,5 мільёна асобнікаў. Гэтая ідэя была пачута і пазней падтрымана і Вярхоўным Саветам, і грамадствам, і журналістамі. Тым здабыткам мы карыстаемся і цяпер. Можа, сёння час іншых ініцыятыў?

«Думаю, парламент можа разгледзець ініцыятыву і такога кшталту, — адказвае **Алена БЕРАСНЕВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.** — Але, мяркую, па-



добнай прапановы ад дэпутатаў не з'явіцца. Бо права быць у дэкрэтным водпуску тры гады заканадаўча замацавана. Пры жаданні ў ім можна знаходзіцца і менш». Дарэчы, мужчыны, па словах дэпутата, таксама маюць права быць у водпуску па доглядзе дзіцяці, але толькі 1% беларускіх татаў і дзядуляў карыстаюцца такой магчымасцю.

«Сапраўды, мужчыны таксама маюць права ісці ў дэкрэтны водпуск, але пакуль усплёску такіх выпадкаў не назіраецца. Напэўна, не варта перакладваць на мужчынскія плечы клопат аб дзіцяці, асабліва аб немаўлятку, — працягвае думку Зінаіда Мандроўская. — Бо мацярынская цеплыня перадаецца ад малака, ад абдымкаў, ад бяссонных начэй, праведзеных разам».

Алена Берасневa дадае, што шмат з якіх ініцыятыў дэпутацкага корпуса па ахове мацярынства ўжо рэалізаваныя. Так, на 1 сакавіка 2016 года 146 мільёнаў долараў ужо залічаны на рахункі людзей у якасці мацярынскага капіталу. Беларусь стала краінай, спрыяльнай для мацярынства. Пры гэтым парламентарый заўважыла, што сярод удзельніц «круглага стала» ёсць і прадстаўніца праваахоўных структур. «Жанчыны занялі даволі важкую пазіцыю ў нашым грамадстве ў сферах, дзе раней іх зусім не было. Наколькі я ведаю, у беларускай арміі каля 4 тысяч жанчын з 50 000, а чатыры з іх даслужыліся да ўзроўню палкоўніка», — дадае яна.

## ПЕРШ ЗА ЎСЁ — АСОБА, А НЕ ТОЛЬКІ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Адна з тых чатырох — палкоўнік міліцыі **Вольга ЧАМАДАНАВА, начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх міліцыі грамадскай бяспекі УУС Мінскага райвыканкама.** Яна на працягу не аднаго года



працуе з праблемнымі падлеткамі. Але і ў гэтым ёсць свая спецыфіка. Вольга Мікалаеўна расказала, што тыдзень таму дырэктар адной са школ папрасіла яе прыехаць на сустрэчу з дзецьмі. Меркавалася, што адбудзецца гутарка на прававую тэматыку. Каб абстаноўка была не вельмі напружанай, інспектар папрасіла дзяцей, вучняў 10-11 класаў, пісьмова задаць пытанні, якія іх хвалююць... (далей) Але калі сароменоцца ўголас.

«Прыйшла, — працягвае Вольга Чамаданава. — Мы селі ў кола. Я рыхтуюся расказваць пра тое, як варта сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі згодна з законам. Разгортваю першую запіску, а ў ёй пытанне: «А колькі ў вас дзяцей?» Другая: «А як вы вырашылі працаваць у міліцыі?» Было каля 15 пытанняў, і толькі тры з іх тычыліся праваой тэматыкі. Падлеткаў цікавіла найперш, як і чаго такая прыгожая жанчына дасягнула ў жыцці.

Начальнік інспекцыі прызнаецца, што за столькі гадоў працы заўважыла, што адна з важных праблем сучасных падлеткаў — адсутнасць ідэалу, да якога варта імкнуцца ў будучыні. «Я часта размаўляю з імі, гляджу ў вочы і спрабую зразумець: чаго ім хочацца? Якіх вяршынь дасягнуць?» — расказвае яна і лічыць, што гэтае бачанне сябе ў будучыні важна закладваць у дзяцей з маленства, бо пазней гэта сфарміруе з іх годных асобаў.

Самая маладая ўдзельніца «круглага стала», **заслужаны майстар спорту Беларусі па мастацкай гімнастыцы Ксенія САНКОВІЧ**, цяпер



працуе ў Нацыянальным алімпійскім камітэце і захапляе жанчын прафесійна займацца спортам. Яна адшукала спосаб дапамогі ў дасягненні мэтаў маладымі дзяўчатамі.

— Калі звярнуць увагу на статыстыку, то мужчынскіх відаў спорту ў праграмаў цяпер болей, чым жаночых. Мужчын, якія займаюцца спортам, значна больш за жанчын. Ёсць імкненне да 2020 года дасягнуць прапарцыйнага складу 50 на 50. У працы нашай камісіі мы імкнёмся звярнуць увагу жанчын да спорту як да часткі культуры, — расказала Ксенія.

Адзін з апошніх праектаў, у якім узяла ўдзел Ксенія Санковіч, — паездка ў горад Петрыкаў Гомельскай вобласці. Там знаходзіцца спецыялізаванае прафесійна-тэхнічнае вучылішча для дзяўчат ва ўзросце ад 13 да 16 гадоў, якія парушылі закон. «Пакуль у іх такі ўзрост, што на іх яшчэ можна паўплываць, — кажа яна. — Мы прыязджалі ў ПТВ са спартсменамі, якія расказвалі пра свае гісторыі поспеху і пра тое, што і ў іх жыцці таксама былі складанасці. Дзяўчаты не засталіся абыякавымі, задавалі пытанні.

А яшчэ падчас падобных сустрэч дзяўчатам расказваюць аб тых беларусках, якія ўжо дасягнулі поспехаў у спорце: Дар'і Домрачавай, Вікторыі Азаранцы, Аляксандры Герасімені, Любові Чаркашынай. «Гэта куміры. Так, модныя і гламурныя. Але тыя, да якіх яскраў і цягнецца моладзь», — прапаноўвае па-іншаму зірнуць на глянцавыя вобразы спартсменка.

***P.S.** Пакуль ішла размова, залу прэс-цэнтра «Дома прэсы» напаўняў пах мімозы, якую ўсім удзельніцам «круглага стала» падарылі перад пачаткам мерапрыемства. Жанчыны вялі гутаркі пра гендарную роўнасць, неабходнасць дасягаць вялікіх мэтаў... Але час ад часу незаўважна кідалі позірк на жоўтыя кветкі — і ў іх вачах з'яўляўся агеньчык цеплыні, які можна ўбачыць толькі на жаночым твары.*

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**




■ Ад фантастыкі — да рэальнасці

# У ПАДАРУНАК — ГЕНЕТЫЧНЫ МАЛЮНАК,

## або Пра што можа расказаць наша ДНК?

**«Раней лічылі, што лёс чалавека запісаны на зорках. Цяпер мы ведаем, што ён запісаны ў яго генах», — гэтыя словы належаць легендарнаму Джэймсу Д'юі Уотсану, амерыканскаму біёлагу, лаўрэату Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне 1962 года. Самую прэстыжную прэмію ў сферы навукі ён атрымаў за адкрыццё структуры ДНК. Вучонаму ўдалося даказаць, што менавіта ў ДНК змяшчаецца ўся інфармацыя пра чалавека. Кім былі нашы продкі? Хто мы ёсць? Кім будуць нашы дзеці?**

**Нягледзячы на свой сталы ўзрост, Уотсан і сёння ездзіць па свеце з лекцыямі і ахвотна расказвае пра даследаванні генома чалавека, якія дазволяць зразумець першапрычыну шматлікіх цяжкіх захворванняў. У будучыні, на думку вучонага, кошт поўнага «прачытання» аднаго чалавечага генома наблізіцца да кошту аўтамабіля. «І вы зробіце гэта для вашага сына ці дачкі, таму што ведаць паслядоўнасць сваёй ДНК не менш важна, чым мець аўтамабіль!» — упэўнены біёлаг.**

### ЗАПРАГРАМАВАЦЬ ЗДАРОЎЕ МОЖНА?

Апошняе дзесяцігоддзе генетыка развіваецца сямімільнымі крокамі. Магчыма, не за гарамі той дзень, калі стане модным дарыць блізкаму чалавеку яго генетычны пашпарт ці генетычны партрэт. **І тое, і другое ўжо можна замовіць у лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук.**

Скажам, генетычны партрэт уяўляе сабой незвычайны малюнак, аснову якога складаюць гены канкрэтнага чалавека. І колькі б тысяч гадоў ні прайшло, на Зямлі не з'явіцца другая такая карціна. Таму што зашыфраваны ў нашых генах ДНК-код унікальны і ніколі не паўтараецца. ДНК, вылучаная са сліны, падвяргаецца полімеразнай ланцуговай рэакцыі, у ходзе якой пэўныя часткі ДНК памнажаюцца ў мільён разоў. Малюнак наносіцца метадам лічбавага друку на паперу, шкло альбо ствараецца мастаком на палатне. Заказчык можа сам выбраць матэрыял, колераване рашэнне і памер карціны. Разам з геннай карцінай яму выдаецца сертыфікат, які пацвярджае праўдзівасць і ўнікальнасць генетычнага партрэта. Але вывучэнне ДНК, зразумела, не проста забава.

— Генетычнае тэсціраванне — абавязковы этап медыцыны будучыні, так званай «медыцыны 4П» — персаналізаванай, прадказальнай, прэвентыўнай (папераджальнай) і партысіпатыўнай, якая прадугледжвае актыўны ўдзел пацыента ў прафілактыцы захворванняў і іх лячэнні, — падкрэслівае **кіраўнік лабараторыі генетыкі чалавека, доктар біялагічных навук, прафесар Ірма МАСЭ** і дадае: — Генетычны пашпарт — гэта персанальны дакумент, які змяшчае ўнікальную інфармацыю аб генетычным кодзе чалавека. ДНК-тэсціраванне дазваляе выявіць яго схільнасць да тых або іншых захворванняў, напрыклад да інфаркту міякарда, атэрасклерозу, ішэмічнай хваробы сэрца, астэапарозу, дыябету, вянозных трамбозаў, рэўматоіднага артрыту і гэтак далей. Асабліва актуальная такая інфармацыя для людзей, сваякі якіх мелі ў анамнезе гэтыя захворванні. Веды пра генетычную схільнасць да развіцця захворванняў дазваляюць ажыццявіць раннюю дыягностыку паталогій, карэктна вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна выбіраць метады прафілактыкі і лячэння.

За перыяд з 2010-га па 2014 год лабараторыяй былі выдадзены 2752 генетычныя пашпарты. А **толькі за мінулы год колькасць выдадзеных «пашпартоў» перавысіла 3 тысячы — каб зрабіць ДНК-тэсціраванне, у лабараторыю звярнулася больш людзей, чым за ўсе чатыры папярэднія гады.** Такім чынам, новая медыцынская паслуга карыстаецца ўсё большым попытам.

Асабліва запатрабавана пацыенткамі дыягностыка прычын невынашвання цяжарнасці. Здараецца, што практычна здаровая жанчына не выношвае запар шэсць цяжарнасцяў, а ўрачы нічым не могуць ёй дапамагчы. Беларускімі навукоўцамі распрацавана тэхналогія ДНК-дыягностыкі рызыкі невынашвання цяжарнасці па 14-ці генетычных маркерах. Выяўленыя генетычныя дэфекты карэктуюцца медыкамі з дапамогай антытрамбатычных сродкаў і прэпаратаў фолievай кіслаты, што спрыяе паспяховаму завяршэнню цяжарнасці. За ўвесь час працы было прадыягнаставана больш як 2 тысячы пацыентак з невядомымі прычынамі невынашвання цяжарнасці. Многія кліенткі ўжо паспяхова нарадзілі дзяцей ці знаходзяцца на позніх тэрмінах цяжарнасці.

Дарэчы, кардыёлагі таксама ахвотна карыстаюцца вынікамі ДНК-дыягностыкі. У медыкаў ёсць пратаколы, як дзейнічаць пры лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў. Але пры ўжыванні аднаго і таго ж прэпарата ў кагосьці лячэнне працякае нармальна, а ў кагосьці кроў згушчаецца і ўтварае трамбы, або, наадварот, узнікаюць крывацёкі. А калі размова ідзе пра такую дарагую аперацыю, як перасадка сэрца? Ці можна тут рызыкаваць? Таму вучоныя, вызначаючы па ДНК генатып чалавека, загадзя высвятляюць, ці падыходзіць яму лекі і якая доза патрабуецца.

ДНК-дыягностыка дазваляе прызначаць прэпараты індывідуальна кожнаму пацыенту — гэта і ёсць персаналізаваная медыцына.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Навуковы супрацоўнік цэнтра калектыўнага карыстання «Геном» Аксана МАЗУР расказвае пра нюансы функцыянавання робатызаванай станцыі для маштабнага выдзялення ДНК.**

### ЧЭМПІЁНАМ ТРЭБА НАРАДЗІЦЦА

Яшчэ адзін цікавы напрамак — спартыўная генетыка. У Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій Інстытута генетыкі і цыталогіі ўжо створаны банк ДНК спартсменаў 20 нацыянальных камандаў. Пратэсціраваны алімпійская зборная каманда Беларусі па біятлоне, нацыянальныя каманды Беларусі па хакеі, тэнісе, прадстаўнікі нацыянальнай зборнай каманды лёгкаатлетаў, хакейная каманда мінскага спартыўнага клуба «Дынама».

Пры ДНК-пашпартызацыі спартсменаў даследаваліся гены, ад якіх залежаць цягавітасць, сіла і хуткасць, гены, што аказваюць істотны ўплыў на стан апорна-рухальнага апарату, адаптацыю да гіпаксіі, здольнасць да аднаўлення пасля фізічных нагрузак, гены росту новых крывяносных сасудаў і гены транспарту кіслароду; гены, адказныя за ломкасць касцей, і гены рызыкі трамбозу; гены сардэчна-сасудзістай сістэмы і вугляводна-тлушчавага абмену.

Цікава, што не ўсе трэнеры пагаджаюцца на генетычныя даследаванні — не разумеюць, што генетыкі могуць дапамагчы выявіць патэнцыяльных чэмпіёнаў. А вось зрабіць іх сапраўднымі чэмпіёнамі могуць толькі яны. Таму трэба проста аб'яднаць намаганні.

Да таго ж генетычнае тэсціраванне спартсменаў дазваляе захаваць іх здароўе, распрацаваць індывідуальны рэжым трэніровак, мінімізаваць магчымыя рызыкі ў атлетаў, напрыклад, папярэдзіць выпадкі раптоўнай смерці падчас фізічных нагрузак — на трэніроўках або спаборніцтвах

У лабараторыю генетыкі чалавека прыводзяць і дзяцей ва ўзросце ад 4 гадоў і старэйшых для тэсціравання на платнай аснове.

— Мы можам выяўляць так званыя гены спартыўнай паспяховасці, — не без гонару кажа Ірма Масэ. — Акрамя таго, можам вызначыць, напрыклад, спрынтарам вырасце дзіця або стаерам. Гэта дапаможа і бацькам, і трэнерам зразумець, якіх вынікаў у будучыні яно зможа дасягнуць. Лепш ведаць загадзя, у які від спорту аддаць дзіця, каб не марнаваць дарэмна час і сілы. **Калі генетыкай спартыўныя дасягненні ў чалавеку не запраграмаваны, то нават кругласутачныя трэніроўкі не прынясуць жаданага выніку...** Больш за тое, яны могуць скончыцца і траўмамі, і іншымі сур'ёзнымі праблемамі са здароўем.

Дарэчы, не выключана, што многія патэнцыяльныя алімпійскія чэмпіёны сёння працуюць бухгалтарамі або інжынерамі і нават не падазраюць аб сваіх выдатных спартыўных здольнасцях. Проста ў свой час ім ніхто пра іх унікальнасць не мог расказаць.

Як не маглі даведацца пра будучыя праблемы і прадстаўнікі многіх экстрэмальных прафесій. І не толькі...

— Псіхаэмацыянальныя якасці і стрэсаўстойлівасць важныя для спецназаўцаў, вадалазаў, пілотаў, авіядыспетчараў, ратавальнікаў і многіх іншых. Урэшце, прычынай большасці тэхнагенных катастроф становіцца чалавечы фактар, — кажа Ірма Масэ. — Нярэдка, нягледзячы на сваю выдатную фізічную падрыхтоўку, моцныя мужчыны «ламаюцца» псіхалагічна, калі трапляюць, напрыклад, на пажар ці на месца катастрофы, дзе ім даводзіцца мець справу з фрагментамі чалавечых цел. Вызначыць псіхаэмацыянальныя якасці чалавека, напэўна, больш складана, чым выявіць схільнасць да таго ці іншага захворвання, паколькі за стрэсаўстойлівасць адказвае шмат генаў. Але мы будзем рухацца разам з нашымі расійскімі калегамі ў гэтым напрамку.

### «ДЫЗАЙНЕРСКІЯ НЕМАЎЛЯТЫ»

У 1997 годзе на экраны выйшаў амерыканскі фантастычны фільм «Гатака». У ім распавядаецца пра генетычна дасканалых людзей, якія займаюць у грамадскай іерархіі самыя высокія пазіцыі. Іх фізічная і інтэлектуальная дасканаласць фарміравалася яшчэ ў прабірках, прычым бацькі маглі заказаць і пол дзіцяці, і колер яго вачэй. А вось людзі, якія нарадзіліся звычайным шляхам (іх называлі «дзецьмі кахання») сталі ў грамадстве людзьмі другога гатунку. Прайшло менш як 20 гадоў, і фантастыка пачынае ўвасабляцца ў жыццё.

Узровень развіцця сучаснай генетыкі ўжо сёння дазваляе бацькам выбіраць пол дзіцяці і колер яго вачэй. У апошнія гады нават разгаралася дыскусія аб этычнасці з'яўлення «дызайнерскіх немаўлят». Амерыканскі тэлеканал зняў нядаўна дакументальны фільм пра пару, якая не пабаялася грамадскага асуджэння і вырашыла звярнуцца да новых тэхналогій, каб ажыццявіць сваю даўнюю мару — зачаць менавіта дачку. Дэбary і Джонатану вельмі хацелася выгадаваць незалежную і разумную дзяўчынку.

Сённяшнія «дызайнерскія немаўляты» — не вынік нейкіх генных мадыфікацый. Усё, што робяць медыкі, — даследуюць атрыманыя ў ходзе экстракарпаральнага апладнення эмбрыёны і выбіраюць з іх самых «правільных».

У 2011 годзе на базе лабараторый Інстытута генетыкі і цыталогіі быў створаны цэнтр калектыўнага карыстання «Геном», дзе сабрана ўнікальнае абсталяванне для правядзення фундаментальных і прыкладных генетычных даследаванняў. Скажам, на адным з такіх прыбораў можна даследаваць адначасова каля сотні ўзораў ДНК з самых розных арганізмаў: напрыклад, ДНК чалавека, жывёлы, расліны і нейкага мікраарганізма. Ён усё будзе «чытаць» адначасова. А адзін «прагон» можна атрымаць усю лінейку кардыягенаў, адказных за сардэчную паталогію пацыента... Па прычыне дарагоўлі такога абсталявання і расходных матэрыялаў да яго мець падобныя прыборы можа дазволіць сабе далёка не кожны рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр. Але ў гэтым няма неабходнасці, бо можна звярнуцца ў цэнтр «Геном».

— Нашымі паслугамі карыстаецца, напрыклад, Цэнтр рэпрадуктыўнай медыцыны. Жанчыны, якія вырашаюцца на экстракарпаральнае апладненне, хочуць быць упэўненымі, што ў іх народзіцца здаровае дзіця. Асабліва калі ў іх прысутнічаюць гены, якія павышаюць рызыку развіцця ў дзіцяці глуханематы ці сіндрому мукавісцыдозу. Тым больш што і ЭКА — паслуга нятанная, — расказвае **навуковы супрацоўнік цэнтра Аксана МАЗУР.** — Паколькі для ЭКА выкарыстоўваецца, як правіла, некалькі эмбрыёнаў, у кожнага з іх вылучаецца ДНК, якую адпраўляюць нам на даследаванне. І мы ўжо тут выбіраем самы здаровы генатып – той, які не мае спалучэння генаў, якія могуць стаць для дзіцяці фатальнымі. Прасцей кажучы, выбіраем самы здаровы генатып і дапамагаем з'явіцца на свет здаровым дзецям.

У заходніх краінах, такіх як ЗША і Вялікабрытанія, забаронена змяняць гены эмбрыёнаў у працэсе ЭКА. Праўда, у Вялікабрытаніі групе навукоўцаў нядаўна далі дазвол змяніць гены эмбрыёна ў ходзе даследавання прычын выкідышаў у жанчын.

Калі вучоныя пачнуць масава рэдагаваць геном — выразаць «дрэнныя кавалачкі» ДНК-ланцужка і замяняць іх на «якасныя», гэта будзе першым крокам у бок стварэння супернемаўлят. З іншага боку, ужо сёння **многія асцерагаюцца страты генетычнай разнастайнасці — эксперты мяркуюць, што большасць сямейных пар будуць «заказваць» бялявых і блакітнавокіх анёлкаў.**

Спецыялісты па біяэтыцы падкрэсліваюць, што самае важнае — каб новыя веды выкарыстоўваліся на карысць чалавецтва, а не на абагачэнне клінік, што **тэхналогіі будучыні павінны быць накіраваны зусім не на «дэкаратыўныя мэты».** Генетыка можа дапамагчы чалавецтву ў барацьбе з многімі спадчыннымі захворваннямі. Магчыма, удасца знайсці зброю і супраць анкалогіі. Ва ўсялякім выпадку, усе намаганні нобелеўскага лаўрэата Джэймса Д'юі Уотсана зараз скіраваны менавіта на барацьбу з ракам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

### ШТО ПАТРАБУЕЦЦА ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ДНК?

**Некалькі стэрыльных ватных палачак. Даследуецца эпітэлій, узяты з унутранай часткі шчок. Кроў не патрабуецца.**

**Кошт паслугі залежыць ад колькасці генаў, што даследуюцца. Максімальны кошт (за даследаванне 34 генаў) складае 6,2 мільёна рублёў.**

**Пры невыношванні цяжарнасці прыблізны кошт даследавання — 1,5 мільёна рублёў.**



**Для таго, каб заказаць ДНК-даследаванне, неабавязкова прыязджаць у Мінск. Узоры (ватныя палачкі ў канверце) можна даслаць і па пошце. Больш падрабязную інструкцыю трэба шукаць на сайце http://www.genpasport.igc.by.**

**У лабараторыі прымаюць заказы і ад замежных грамадзян. Для іх кошт паслугі адрозніваецца, але не вельмі істотна.**

## Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД»

(УНП 600025392):

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ-3110 | 2 874 000 |
| 2 | Автомобиль ВАЗ-21074 | 2 040 000 |
| 3 | Автомобиль ГАЗ-33023 | 4 014 000 |
| 4 | Ящики вино-водочные пластмассовые | 5 280 (за штуку) |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно третий раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 18.02.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 50%.*

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Тракторный прицеп самосвальный 2ПТС-6 | 9 000 000 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно. Публикация об аукционе ранее публиковалась 21.01.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%.*

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой полуприцеп-цистерна ПП 9370, 1984 года | 45 000 000 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №3, проводятся повторно. Публикация об аукционе ранее публиковалась 01.09.2015 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%.*

**Торги в виде аукциона состоятся 24 марта 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10 (по месту нахождения организатора торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения.**

**Шаг аукциона – 5 процентов.**

**Продавец – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД» (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88).**

**Организатор торгов – ООО «Партнёр-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 395-30-88).**

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. *Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с №3012610007128 в филиале №612 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 810, УНП 600025392, получатель – ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 10 дней с даты подписания договора купли-продажи

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость

| № п/п лот | Наименование имущества | Кол-во, мера, вес | Отличительные признаки, степень износа | Оценка, общая стоимость |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Рекламная вывеска | 1 шт. | Бывшая в употреблении | 7.224.000 бел. рублей |
| 2 | Кресло «Престиж» | 3 шт. | По стоимости 114.400 бел. рублей за 1 шт. | 343.200 бел. рублей |
| 3 | Защитный роллет (1370х2250) | 1 шт. | Бывший в употреблении | 658.400 бел. рублей |
| 4 | Защитный роллет (2350х2700) | 1 шт. | Бывший в употреблении | 1.357.600 бел. рублей |
| 5 | Стол письменный с подвесной тумбой | 3 шт. | По стоимости 706.400 бел. рублей за 1 шт. | 2.119.200 бел. рублей |
| 6 | Шкаф двухдверный | 2 шт. | По стоимости 414.400 бел. рублей за 1 шт. | 828.800 бел. рублей |
| 7 | Аппарат высокого давления РВ10.25-4Ы186-200 | 1 шт. | Бывший в употреблении | 11.892.800 бел. рублей |
| 8 | МФУ PANASONIC KX-MB 1500RU | 1 шт. | Бывший в употреблении | 631.200 бел. рублей |
| 9 | Автомобиль ЗИЛ 131 ВС 222-01 | 1 шт. | Бывший в употреблении | 139.773.600 бел. рублей |
| 10 | ПЭВМ ICS | 1 шт. | Бывший в употреблении | 4.256.000 бел. рублей |
| 11 | ПЭВМ HAFF OPTIMA | 1 шт. | Бывший в употреблении | 1.298.400 бел. рублей |
| 12 | ПЭВМ HAFF OPTIMA | 1 шт. | Бывший в употреблении | 1.013.600 бел. рублей |
| 13 | ПЭВМ HAFF OPTIMA | 1 шт. | Бывший в употреблении | 1.044.800 бел. рублей |
| 14 | ПЭВМ HAFF OPTIMA | 1 шт. | Бывший в употреблении | 1.051.200 бел. рублей |

| | |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | Витебская область. Право собственности: ОДО «Юверс 2007» |
| **Местонахождение имущества** | г. Витебск<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к заместителю директора ОДО «Юверс 2007» – Салин Сергей Анатольевич (тел. моб. 8029-895-00-24) |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5<br>28 марта 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5<br>Судебный исполнитель<br>Колядко Александр Михайлович,<br>тел. (0212) 61 40 09, т.м. 37533-687-91-20<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович,<br>тел. (0212) 61 40 15 |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ООО «АТЭП ЮЗУФОВО» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **склад** общей площадью **983,4 кв.м**, инв. № 600/С-128577;
- **складское здание с помещениями СТО** общей площадью **815,5 кв.м**, инв. № 600/С-128578;
- **здание административно-торговое** общей площадью **133,4 кв. м**, инв. № 600/С-128872;
- **площадка** общей площадью **6339,0 кв.м**, инв. № 600/С-129138;
- **склад** общей площадью **349,9 кв.м**, инв. № 600/С-152072.

Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 623688200001000197 площадью **1,4228 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, 28, район аг. Юзуфово.**

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона (0,1656 га), охранная зона линии электропередачи (0,0285 га).

**Начальная цена с НДС (20%) – 15 000 000 000 бел. руб. Задаток 5%** от начальной цены **(750 000 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.04.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.04.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-61-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, пониженная на 10%, с учетом НДС, руб. | Задаток, 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Лот № 7 – капитальное строение: Дорога № 1 с инвентарным номером 110/С 110801 площадью 1437 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная 7/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002575 площадью 0,1437 га | 836 406 509 | 167 281 301 |

Повторный аукцион состоится **01 апреля 2016 года в 14.00** по адресу: **225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7 каб. 503, 5 этаж.**

**Организатор аукциона:** открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО», г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7 каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **29.03.2016**.

*Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.*

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

**Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (80163): 47-63-80, 47-64-93, 47-64-85.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Грудок, д. Сосновая, д. Лужки, д. Задомля Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 14 апреля 2016 года в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,1478 га, № 624883002601000047, д. Грудок (по гп. № 2)<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624883010101000464, д. Сосновая (по гп. № 1)<br>Лот № 3 – площадь 0,1400 га, № 624883005601000168, д. Лужки (по гп. № 5)<br>Лот № 4 – площадь 0,1500 га, № 624883004601000322, д. Задомля (по гп. № 1)<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га, № 624883004601000321, д. Задомля (по гп. № 2) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 200 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 250 000 000 рублей<br>Лот № 3 – 200 000 000 рублей<br>Лот № 4 – 200 000 000 рублей<br>Лот № 5 – 200 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Грудок – нет;<br>д. Сосновая – электричество;<br>д. Лужки – нет;<br>д. Задомля – нет;<br>д. Задомля – нет |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 8 апреля 2016 года в 17.00 |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона (Лот № 1 – 12 423 000 белорусских рублей, лот № 2 – 14 835 000 белорусских рублей, лот № 3 – 10 753 000 белорусских рублей, лот № 4 – 14 215 000, лот № 5 – 13 662 000 белорусских рублей) ко всем лотам плюс стоимость затрат на публикацию информационного сообщения (объявления) в газете подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицом – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

## Извещение о проведении 12 апреля 2016 года торгов с условиями по продаже квартир, принадлежащих ООО «Лада ОМС Энерго»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная стоимость, доллары США | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | квартира № 13, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 1, кв. 13 (однокомнатная, 4 этаж, общая площадь – 38,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 40,3 кв. м) | 48 360 | 95 000 000 |
| 2. | квартира № 14, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 1, кв. 14 (двухкомнатная , 4 этаж, общая площадь – 58,8 кв. м, общая площадь по СНБ – 61,0 кв. м) | 73 200 | 140 000 000 |
| 3. | квартира № 27, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 1, кв. 27 (двухкомнатная, 8 этаж, общая площадь – 59,3 кв. м, общая площадь по СНБ – 61,5 кв. м) | 73 800 | 145 000 000 |
| 4. | квартира № 28, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Щорса, д. 1, кв. 28 (двухкомнатная, 8 этаж, общая площадь – 37,9 кв. м, общая площадь по СНБ – 39,9 кв. м) | 47 880 | 94 000 000 |

**Продавец имущества:** ООО «Лада ОМС Энерго», ул. Щорса, 1А-2, 220014, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**:

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от окончательной стоимости предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств.

2. Победитель торгов (покупатель) оплачивает стоимость предмета торгов, определенную в результате торгов, в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в срок, определенный договором купли-продажи предмета торгов с учетом внесенной суммы задатка.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «Лада ОМС Энерго», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе с приложением (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 3 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.

Расходы, связанные с удостоверением, государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **12 апреля 2016 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.03.2016 по 07.04.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (044)736-44-44.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(044)736-44-44 (ООО «Лада ОМС Энерго»).**




## ПАРАШУТ, ШТО ЎЗНЯЎ ДА НЯБЁС...

Надоечы даставала з паліцы сямейны альбом і з яго выпала фотакартка. Падняла і вачам не паверыла: «Божухна, гэта ж я... Колькі мне тут? Гадоў шаснаццаць?»

...Час быў ліхі, пасляваенны — ні паесці, ні абуць, ні надзець. А ў такім узросце (тым больш дзяўчынкам) хочацца ж неяк вылучыцца, нечым фарсануць, паказаць сябе, сваю прыгажосць. Добра было да вайны: тата ў камандзіроўкі ездзіў, прывозіў мне розныя сукеначкі, спаднічкі, нават блакітныя валёначкі! Было чым выхваляцца. А потым...

Вайна — праклятая — паламала ўсё жыццё, назаўсёды забрала бацьку, пакінула каго скалечаным, каго голым і босым. Мне, у прыватнасці, зімнім абуткам служылі буркі. Мама іх шыла сама, з рознай старызны. А паверх яе абуваліся чуні. Майго, малога, памеру яны, відаць, не выпускаліся. Таму я хадзіла ў вялікіх, якія на кожны мой крок адзываліся гучным «ква-а-а»... Сорам! Хоць ты басанож хадзі...

Але ж міналі зімы ды вёсны, і аднойчы здарыўся цуд: у нас з'явіўся адрэз тканіны! Ды якой — белага парашутнага шоўку (!), з якога *мне* (а мама ж і сама яшчэ маладая) магла атрымацца сукенка!

Радасць была без межаў!

Разам з мамай мы прыдумлялі фасон, потым кроілі, потым мама — пераважна адна — узялася шыць.

Шыла яна рукамі, бо швейную машынку мы даўно памянялі на хлеб, так што справа рухалася марудна (ва ўсякім разе зусім не так, як хацелася мне).

Аднак ужо з самай першай прымеркі ў мяне захапіла дух: «Божухна, як жа гэта чароўна! Як прыгожа! І як мне пасуе!..»

З тых хвілін я страціла спакой: увесь час, здаецца, думала толькі пра сукенку. Нават ноччу — варта было заплюшчыць вочы, як перад імі паўставала сапраўдная прынцэса, Дзюймовачка, я... У белай шаўковай сукенцы.

І вось — нарэшце — яна пашытая, можна надзяваць! Я прыбіраюся, нібы на крылах лячу ў школу; лячу, як сапраўдны матылёк, бо ніз у сукенцы — званочкам, рукаўчыкі — ліхтарыкамі. І на нагах у мяне ўжо не чуні, а спрытныя чаравікі — якраз па маёй назе!.. Я казачна прыгожая і такая шчаслівая!.. Проста самая-самая! Ва ўсім белым свеце! І ўвесь гэты свет я гатова абняць — пачаўшы з... сяброўкі. Яна зараз выйдзе з завулачка, гляне на мяне і ахне!.. Скажа: «Пакажыся...». І я тады крутнуся перад ёй на адной назе, каб яна з усіх бакоў пабачыла, які ж на мне цуд!..

Сяброўка і сапраўды ўжо чакала мяне на выхадзе з завулачка.

Але крутнуцца перад ёй я не паспела, бо тая, скоса глянуўшы, выдала:

— Ну ты даеш!.. Хто ж надзявае белую сукенку з цёмнымі чаравікамі?! Гадка глядзець!

Пасля гэтых слоў, нават не зірнуўшы ў мой бок, яна пайшла да школы.

Я засталася стаяць, бо проста не магла зрушыцца з месца, бо ніколі яшчэ не адчувала гэтакай крыўды і знявагі! Сукенка з белага шоўку ў міг вока ператваралася ў нешта недарэчнае, парашутнае. І я ў ім была — дурніца дурніцай...

Азірнуўшыся, перавёўшы дух і ўцягнуўшы галаву ў плечы, я рушыла ўслед за сяброўкай. І вось парадокс: мне паранейшаму здавалася, што ўсе глядзяць на мяне. Але ж цяпер — глядзяць і смяюцца, смяюцца з таго, што я ў белай сукенцы з чорным абуткам.

...Хадзіла я так досыць доўга, бо туфляў (а тым больш светлых) у мяне не было. Хадзіла ціхімі завулкамі, каб як мага менш людзей бачылі мой недарэчны ўбор...

Гады прайшлі, нават дзесяцігоддзі! Мноства абноў было! Але ніякая з іх — хай самая дарагая і модная — не падарыла мне столькі шчасця, не ўзняла мяне ў такія светлыя высі, як тая сукенка з парашутнага шоўку.

І... не апусціла таксама.

...З вялікім шкадаваннем я палажыла фота ў сямейны альбом, затым — альбом у шафу.

Там цяпер да халеры ўсякага адзення! Толькі прыбірайся, здавалася б. Але ж... марна, бо што ты ні надзень, а ніколі больш не станеш такой маладой і прыгожай, як у свае шаснаццаць.

**Раіса Васільева,**
*г. Гомель.*

## ЧАЛАВЕК З ЕЎРОПЫ

...Сваё прозвішча, імя і імя па бацьку эстонец Ыгісоо Ційт Каарэловіч сам запісаў у маю запісную кніжку. Я проста не змог — нават пад трэцюю дыктоўку.

У Маскве мы з Ційтам жылі ў адным гасцінічным нумары. Зранку разыходзіліся па сваіх справах, вечарам — бавілі час да сну. Выдатна ладзілі, бо кожны займаўся сваёй справай і суседу не перашкаджаў. Да таго ж у мяне змалку мелася добрая звычка: я з пашанай ставіўся да ўсіх старэйшых (нават на крыху), а Ційт быў на «шмат» — аж на 10 гадоў!

Розніца, як быццам, ёсць, але ж ён прыезджы, і я прыезджы, так што запатрабаванні амаль аднолькавыя.

Дык вось. Аднойчы (як сёння помню — у чацвер) у нас абодвух выдалася «фортка» — амаль паўднёўка вольнага часу, і мы з суседам вырашылі прайсціся па крамах. Не прыгадаю, што ў той час было ў дэфіцыце ў Эстоніі, у нас жа, у Беларусі — амаль што ўсё. Адпаведна, шопінг у Маскве быў шчаслівай аказіяй, асабліва калі ў сям'і ўжо двое малых, якія чакаюць бацьку...

У пошуку падарункаў і прысмакаў мы з Ційтам абышлі, аб'ехалі мноства крам, а ўрэшце нагулялі такі апетыт...

Вырашылі паесці, тым больш што камандзіроўка заканчвалася, а нейкія рублі яшчэ заставаліся. Дык чаму б не пакінуць іх — хай і ў рэстаране. Будзе ж што ўспомніць?

І сапраўды: Масква ўсё ж Масква! У Мінску ў чацвер, мусіць, і цяпер такога не ўбачыш. А там — дым каромыслам: поўная зала людзей, музыка, спевы, танцы... Прычым рэстаран гэты — з разраду просценькіх: наводшыбе, без гучнага імя...

І тым не менш мы з Ційтам «нідзе не дзеліся», — трапіўшы ў атмасферу ўсеагульнага загулу, вырашылі шыкануць: заказалі бутэльку шампанскага (у той час гэта быў вялікі дэфіцыт), тое-сёе з ежы... Выпілі (на галодны страўнік), перакусілі і падаліся туды, дзе паркет і музыка, дзе мужчыны і жанчыны — вялікае кола і, як той казаў, танцуюць усе!

Мы з Ційтам таксама збіраліся, аднак ён дайшоў да кола, паглядзеў на людзей і рушыў назад да століка. Я таксама вяртаюся. Пытаю:

— Што здарылася?

— У нас, у Эстоніі, — кажа Ційт, — няма такой звычкі — танцаваць без жанчыны.

Няма дык няма. Настрой крыху сапсаваўся, але ж мы павячэралі. Падышоў афіцыянт. Я разлічыўся, гэта значыць, грошы аддаў за абодвух — думаў, Ційт потым верне...

Нічога падобнага: ні ў той вечар, ні наступным ранкам ён нават не ўспомніў, што вінаваты, чым давёў мяне, мякка кажучы, да крайняй раздражнёнасці! Ну чаму, скажыце, я за свае кроўныя і, вядома ж, не лішнія грошы, павінен некага карміць у рэстаране і паіць шампанскім?..

Ційт на маё пытанне адказаў недзе праз суткі, ужо перад ад'ездам:

— Я запрашаю цябе на абед, — прамовіў ён.

— Куды? — ад нечаканасці я нават разгубіўся.

— У рэстаран «Арбат».

І дадае праз паўзу:

— У нас, у Эстоніі, звычка такая: калі адзін чалавек пачаставаў другога, то гэты другі павінен адказаць яму тым жа.

Хоць скрозь зямлю праваліся! Я, атрымліваецца, цэлы вечар, ноч, усю раніцу і амаль увесь дзень у думках бэсціў яго апошнімі словамі, вінаваціў ледзь не ў грабяжы... А ён у гэты час думаў, як мне аддзячыць — заказваў столік не проста ў рэстаране, а ў славутым «Арбаце»!

Парадкі ў ім яшчэ тыя — былі і, відаць, засталіся: кліентаў пачынаюць «аблізваць» ужо з парога, можна сказаць, «пад ручкі» падводзяць да столікаў, а далей — болей... Мне дык нават непрыемна было. А Ційту, бачу, хоць бы хны, ён як рыба ў вадзе! І мы так добранька з ім пасядзелі!..

Але ж нарэшце выходзім з «Арбата», ідзём па вуліцы. Настрой у мяне — каб лепш, дык на халеру... Я з той радасці цыгарэтай Ційта частую (што ку́рыць, — дакладна ведаю: не першы ж дзень у адным пакоі жывём), але ён... не бярэ?! Кажа:

— У нас, у Эстоніі, няма звычкі курыць на хаду. Вось трапяцца недзе сметніца, лаўка — тады пастаім (ці пасядзім) і пакурым.

...Такім чынам просты хлопец Ційт з эстонскага мястэчка Козэ-Ууэмыйза за нейкія суткі-другія навучыў мяне, па-першае, паважаць сябе і жанчын (калі танчыць, то толькі ў пары), па-другое, давяраць тым, хто побач — у гасцініцы, на адпачынку, у рэстаране. І па-трэцяе, паважаць людзей: курыць у адведзеных месцах, падтрымліваць чысціню, дзе б ні быў — у гасцях ці дома.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## НЕ ПРАХОДЗЬЦЕ МІМА

Недзе ў 70-х гадах мінулага стагоддзя быў я ў Падмаскоўі ў санаторыі: адпачываў, лячыўся, разам з іншымі ездзіў на экскурсію ў Маскву, хадзіў у маўзалей... А неяк раз кажу сваім землякам:

— Хлопцы, вёска непадалёку... Давайце сходзім паглядзім, якія тут парадкі, як людзі жывуць. Цікава ж?

— І праўда, — згадзіліся яны.

Выбралі мы дзень — бязветраны, сонечны. І вось ушасцёх крочым у бок паселішча. Вуліца там шырокая, дамы драўляныя і побач з адным — работа «кіпіць»: пажылая кабета (бабуля, відаць) з унучкай-падлеткам дровы пілуюць. Куча — вышэй плоту, вялікая-вялікая... Такую старой ды малой пілаваць і пілаваць — да Каляд не паспеюць.

Шкада іх стала. Ціха кажу сваім:

— Мужыкі, не для жаночых рук гэта праца... Давайце паможам?

А мужыкам, гляджу, і казаць нічога не трэба: скінулі пінжакі, закасалі рукавы... Бабулю адправілі да суседзяў — пазычыць яшчэ адну пілу і сякеру, козлы змайстравалі. Глядзіш, і закіпела ў нас работа: чатыры чалавекі пілуюць, двое сякуць (праз пэўны час мяняемся). А бабуля з унучкай толькі паспяваюць гатовыя паленцы адносіць ды недзе за хатай складваць...

Не помню, колькі мы шчыравалі так — гадзіну, дзве, але ж справа да завяршэння дайшла. Гаспадыня ледзьве не плача — не ведае, як аддзякаваць. Кажа:

— Сыночкі, я ж не заплачу вам за вашу нялёгкую працу. Няма ў мяне грошай...

— Можна падумаць, — смяецца нехта з землякоў, — мы да вас у заробкі прыйшлі. Мы міма праходзілі, хацелі вашу вёску паглядзець.

— Дык тады ў хату зайдзіцеся, — гне сваё гаспадыня. — У мяне там вінца бутэлечка ёсць. Я хоць трохі вас пачастую, хоць так ды аддзячу, каб у даўгу не быць.

— Не любіце даўгоў? — смяемся мы. — Дык тады скажыце нам «шчыры дзякуй», але тры разы.

— Я, хлопчыкі, сто разоў ваш «дзякуй» скажу!.. Усю зімачку буду гаварыць, у печцы палячы... Але ж прызнайцеся, хто вы такія, адкуль вас Бог прыслаў?

— З Беларусі, — сказалі мы, адвітаўшыся, і пакіравалі назад у санаторый.

Азірнуліся яшчэ праз хвілінку. І ўбачылі, як да бабулінай хаты падцягваюцца вяскоўцы: відаць, дапытваюць гаспадыню, дзе яна знайшла такую брыгаду і колькі заплаціла ёй?

Што адказвала бабуля, мы, вядома ж не чулі, але хацелі, каб яна гаварыла, што дапамаглі ёй беларусы. Задарма.

**Міхаіл Чарняўскі,**
**ветэран вайны і працы,**
*курортны пасёлак Нарач,*
*Мядзельскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОДО «СПАРТАК ПЛЮС»,** г. Минск, ул. М. Лынькова, 12, корп. 2 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Торговый зал, кабинет, гардеробная, склады, моечная | Торговое помещение | 151 кв.м | 500/D-708166944 | г. Минск, ул. Михася Лынькова, 19/ 2-13а |

**Начальная цена с НДС 20% – 1 700 000 000 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Срок оплаты предмета аукциона** | **5** банковских дней после заключения договора купли-продажи |

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.12.2015*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **30.03.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **28.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:**

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**12 апреля 2016 г. в 11.30 состоятся ОТКРЫТЫЕ аукционные торги по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лота № 1 (предмет торгов):**
**- капитальное строение 602/С-24223 (здание лукумного цеха), общ. пл. – 516,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369) |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск в здании Бобруйского управления филиала |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | **950 679 000** рублей, размер задатка – 10%, что составляет – **95 068 000** рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 624450100001028 расположен по адресу: Минская область, Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21, площадь участка – 5,2900 га предоставлен на праве аренды ОАО «Пуховичский пищекомбинат». Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код - 2 |
| **Характеристика текущего состояния предмета торгов** | Здание цеха – одноэтажное, кирпичное, фундамент – бутовый, перекрытия – ж/бетон., полы – бетон., имеется центральное отопление, водопровод, электроснабжение, кипич. пристройка с основ. назначением |
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | **по 07 апреля 2016 г. включительно до 16.00** |

**Для участия в торгах в адрес Организатора торгов необходимо предоставить**: заявление на участие в торгах; документ с отметкой банка, подтверждающий о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет; паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;
**Резидентам Республики Беларусь: индивидуальным предпринимателям** – свидетельство о государственной регистрации; **юридическим лицам** – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации); **представителю физического лица и индивидуального предпринимател**я – нотариально заверенную доверенность.
**Нерезидентам Республики Беларусь:** иностранным юридическим лицам, иными организациям – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; индивидуальным предпринимателям – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителю иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иностранной организации – легализованную в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.
**Порядок проведения торгов**: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**. Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным

**Победитель (Претендент на покупку**) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон и на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов, в размере 2,5% от начальной цены продажи

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**

■ Прэзентацыя

# ПАДАРОЖЖА Ў XIX СТАГОДДЗЕ

## Унікальны праект — «Канкарданс беларускай мовы XIX ст.» прэзентаваны ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі

**Канкарданс... гэтае слова гучыць, як назва еўрапейскага сярэднявечнага танца. Праўда, у рэчаіснасці яно зусім не мае дачынення да танцавальнага мастацтва, але свае вытокі бярэ ўсё ж у Сярэднявеччы. Першы канкарданс — слоўнік-даведнік, складзены на падставе поўнага корпуса тэкстаў — быў створаны ў Еўропе ў XIII стагоддзі і грунтаваўся на Бібліі. Цікава, што ў тыя часы над яго распрацоўкай шчыравалі ажно 500 манахаў.**




Стварэнне канкарданса было справай вельмі працаёмкай і доўгатэрміновай (варта ўлічыць усе словы, якія ўжываюцца ў тэкстах, што вывучаюцца, прывесці іх кантэкст і паказаць месца згадкі ў творы), таму першыя падобныя працы прысвячаліся самым значным кнігам — Бібліі, Карану, «Ведам» і творам Уільяма Шэкспіра.

Стварэнне сучаснага «Канкарданса беларускай мовы XIX ст.» пачалося ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі яшчэ ў 1979 годзе. І XIX стагоддзе для такога падрабязнага вывучэння мовы было выбрана не выпадкова. Гэта надзвычай цікавы, але і вельмі недаследаваны з пункту гледжання мовы час. Тады наша нацыя існавала насуперак палітыкам паланізацыі і русіфікацыі, а беларуская мова афармлялася як мова мастацкай літаратуры.

— Грунтоўны канкарданс — унёсак у справу развіцця роднай мовы, яе папулярызацыю, рэпрэзентатыўнасць сярод моў свету. Гэтая праца — важкі навуковы здабытак для нашай краіны, — падкрэсліў дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі акадэмік Аляксандр Лакотка.

«Канкарданс беларускай мовы XIX стагоддзя» пабачыў свет у Выдавецкім доме «Беларуская навука» ў выглядзе электроннага выдання на кампакт-дыску. Такое рашэнне можна патлумачыць неверагодна вялікім аб'ёмам інфармацыі, што змяшчае работа: калі раздрукаваць усе даведнікі, якія ў яго ўваходзяць, на паперы, атрымаецца каля 20 тамоў!

Ніна Сянкевіч, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, якая шмат гадоў працавала над распрацоўкай канкарданса (яна праграміст па адукацыі) і яго напаўненнем, расказала:

— Калі праца над канкардансам толькі пачыналася, навукоўцы не мелі поўнага корпуса тэкстаў, напісаных аўтарамі ў XIX стагоддзі. Першапачаткова аналізавалася толькі 283 творы. Але работа над гэтым грунтоўным выданнем падштурхнула і да выяўлення новых тэкстаў, пошуку рукапісаў і больш поўных варыянтаў твораў. І сёння ў корпусе канкарданса — 497 тэкстаў. Гэта як вядомыя нам творы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Каруся Каганца, Аляксандра Ельскага, Кастуся Каліноўскага, іншых аўтараў, так і зусім новыя тэксты.

Каго можа зацікавіць такое выданне? Натуральна, спецыялістаў-мовазнаўцаў, лексікографаў, якія працуюць над складаннем новых слоўнікаў. Але «Канкарданс беларускай мовы XIX стагоддзя» можа быць цікавым і простаму чытачу, захопленаму гэтым часам: апроч неапасрэдна слоўнікаў і канкардансаў мовы асобных аўтараў, на дыску можна знайсці і спісы твораў XIX стагоддзя, і самі тэксты, напісаныя ў той час.

Але мне бачыцца яшчэ адзін аспект выкарыстання гэтага канкарданса: ён можа быць надзвычай карысным для пісьменнікаў і драматургаў, бо дапаможа ўзнавіць стылістыку, лексічны складнік мовы таго часу, дазволіць дакладна стварыць характары герояў, якія жылі ці маглі жыць на Беларусі ў XIX ст ■

■ Ініцыятыва

# ...І КАНЦЭРТЫ БЕЗ РЭПЕТЫЦЫЙ

## КЛУБ АМАТАРАЎ «ЖЫВІЦА»: АД ВЫТОКАЎ ДА ПОСПЕХУ

**Народны клуб кампазітараў і паэтаў «Жывіца» працуе пры Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці ўжо амаль паўтара дзесяцігоддзя. Пра талент удзельнікаў суполкі крыху раскажуць лічбы: за гэты час 20 паэтаў, яго выхаванцаў, прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, у клубе падрыхтаваны і пабачылі свет 6 песенных дыскаў, 17 паэтычных кніг, два новыя выданні ужо сёлета прапанаваны чытачам. Кожны з сяброў імкнецца выдаць свой уласны зборнік вершаў, запісаць музычны дыск. І для многіх з іх такая мара ўжо стала рэальнасцю, нават не раз. Удзельнікі клуба з задавальненнем прымаюць удзел у міжнародных, рэспубліканскіх і абласных святах, фестывалях і імпрэзах, а летась «Жывіца» стала лаўрэатам абласнога конкурсу «Творчы алімп Міншчыны» ў намінацыі «Аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах».**

За гэтымі крыху сухімі, але тым не менш уражальнымі фактамі (гаворка ж ідзе пра аматараў!) — шмат працы, перажыванняў і клопатаў удзельнікаў, гадзіны кансультацый з прафесіяналамі і вялікая арганізатарская работа. Таму сёння разам з **заснавальніцай і кіраўніцай клуба, паэткай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, музыкантам Ірынай КАРНАУХАВАЙ** мы ўспамінаем вытокі і спрабуем разгадаць феномен поспеху «Жывіцы».

***— Ірына Аляксандраўна, сёння клуб аб'ядноўвае ўжо шмат удзельнікаў, мае за плячыма багаты досвед працы. А з чаго ўсё пачыналася?***

— Я сама, калі пачынала пісаць, вельмі доўга шукала кансультанта, які б паглядзеў мае вершы і параіў, ці варта працаваць далей, якія недахопы трэба выпраўляць у творах. А паколькі я чалавек вельмі цікаўны, глыбока вывучаю пытанне, трэніруюся, пакуль не атрымаецца дасканала, то ў выніку... стварыла народны клуб кампазітараў і паэтаў. Самая першая задача была — сабраць людзей, згуртаваць іх, каб яны маглі дзяліцца досведам, паказваць свае напрацоўкі і кансультаваць адно аднаго. Я ад пачатку была ўпэўнена, што на Міншчыне многа таленавітых паэтаў, кампазітараў. Так і аказалася. Спачатку разаслала лісты-запрашэнні і адмыслова распрацаваную анкету ў раёны, стварыла базу звестак творцаў, правяла самы першы вялікі творчы сход у Смалявічах. Атрымалася проста выдатная вечарына. І ведаеце, асноўная частка ўдзельнікаў той сустрэчы дагэтуль у клубе. Такая салідарнасць, яднанне дарагога вартыя.

***— Праца клуба грунтуецца менавіта на ўзаемадапамозе?***

— Так, але не толькі. Мы пачалі адно аднаго чытаць — гэта ўжо выйсце. Больш вопытныя творцы сталі вычытваць вершы калег, рэдагаваць. Яны ўвесь час стэлефаноўваюцца, перапісваюцца. Я ж арганізоўваю розныя школы, праводжу заняткі па творчым майстэрстве падчас пасяджэнняў нашай суполкі. Спачатку, калі клуб толькі арганізаваўся, я зразумела, што сама наўрад ці змагу працаваць з усімі паэтамі. Многія з іх ужо былі вопытнымі, амаль прафесійнымі творцамі. Стала шукаць паэтаў, якія маглі б дапамагаць. І такія людзі знайшліся. Паэткі Галіна Каржанеўская, Аліна Легастаева і паэт Васіль Жуковіч прыходзілі на пасяджэнні, аналізавалі вершы, паказвалі на недакладнасці ў творах пачаткоўцаў і дапамагалі іх выпраўляць, укладалі зборнікі.

***— Вы працуеце з паэтамі, развіваеце іх творчыя здольнасці. Як адбываецца такая праца падчас пасяджэнняў?***

— Робім такія практыкаванні: я кажу фразу — і паэты на хаду павінны напісаць верш, прадоўжыць прапанаваны пачатак. Ці рубрыка «Сам сабе рэдактар»: раздаю вершы, у якіх варта выправіць некаторыя хібы, а ў рубрыцы «Пад уражаннем» мы разбіраем і абмяркоўваем тэксты, складаныя для разумення. Ёсць у нас і адмысловая школа акцёрскага майстэрства, дзе мы вучымся прыгожа дэкламаваць вершы



са сцэны. Літаратурная і кампазітарская творчасць — надзвычай складаная праца.

***— Заданні, пра якія вы распавялі, могуць зацікавіць і школьнікаў, і больш сталых творцаў. Людзі якога ўзросту — сябры «Жывіцы»?***

— Узрост удзельнікаў абсалютна розны. Ёсць члены клуба, якія прыйшлі ў «Жывіцу» яшчэ школьнікамі, сёння яны ўжо студэнты. Ёсць пажылыя ўдзельнікі, ім ужо за 80. Мы — адна вялікая сям'я, на свае сустрэчы збіраемся з розных гарадоў і вёсак вобласці ў любое надвор'е. Самае важнае для ўдзельнікаў — зносіны, абмен думкамі, навінамі, выступленні. Гэта ўжо неабходнасць.

***— Узаемадапамога — гэта выдатна. А ці арганізоўваеце сустрэчы з вядомымі творцамі, майстар-класы прафесіяналаў?***

— Такіх сустрэч праходзіць шмат. На пасяджэнні клуба часта запрашаем пісьменнікаў, кампазітараў, якія ўжо маюць вялікі аўтарытэт у краіне і за мяжой. Гэта, напрыклад, паэты Міхась Пазнякоў, Анатоль Аўруцін, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Васіль Жуковіч, Анатоль Зэкаў, актрысы Раіса Астрэдзінава, Ірына Нарбекава, вядомы спявак Дзядзя Ваня, кампазітары Алена Атрашкевіч, Валерый Карэтнікаў, Алег Молчан, Алег Елісеенкаў, Дзмітрый Даўгалёў і іншыя. Два разы на год ладзім творчыя лабараторыі і практычныя майстар-класы. Яны сапраўды карысныя, бо адна справа — проста прыйсці пазнаёміцца, паслухаць вядомага чалавека, і зусім іншая — павучыцца ў яго ствараць новыя вершы, песні, прадумваць вобразы для сцэны.

***— Не магу не запытацца пра графаманію ў «Жывіцы». Як тут з гэтым змагаюцца?***

— Час усё расставіць на месцы. Такіх геніяў, як Колас і Купала, у нашым клубе няма, ды і нараджаюцца яны раз на сотню гадоў. Але справа не ў гэтым. Калі ў чалавека ёсць жаданне, імкненне да творчасці ў любым выглядзе — кулінарыя, садоўніцтва, патрэба пісаць, то чаму не? Нашы сябры пішуць, развіваюць свае творчыя здольнасці. Але графаманства, проста вершаплёцтва тут ужо не праходзіць. Тыя, хто не ставіцца сур'ёзна да працэсу стварэння вершаў, хто не ўпэўнены ў іх узроўні, нават не спрабуюць выходзіць на сцэну і чытаць, яны стараюцца працаваць над сабой. Падчас пасяджэнняў ёсць рубрыка «Новыя асобы ў клубе», дзе мы даём слова навічкам. Калі нешта ў іх творах будзе не так, то нашы сябры самі падкажуць, дапамогуць, параяць. Мякка, ветліва, але строга і справядліва.

***— І як новыя ўдзельнікі ставяцца да крытыкі?***

— Звычайна ўсе парады і крытычныя заўвагі ўспрымаюцца добра. Але былі і такія паэты — часцей мужчыны, — якія вельмі негатыўна ставіліся да заўваг і толькі праз два гады пасля першай сустрэчы зноў вярталіся ў клуб. Часам сапраўды бачыш, што ў вершах пачаткоўца ёсць жывое слова, рацыянальнае зерне, і яму дастаткова проста дапамагаць парадамі, крыху падказваць і вучыць. А школа ў нас склалася вельмі моцная. Напрыклад, Галіна Нічыпаровіч з Узды, Галіна Мароз з Лагойска, Лілія Мялешка з Клецка, Уладзімір Цанунін і Віктар Кажура з Вілейкі (а ён працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры) ужо сталі членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, але працягваюць наведваць пасяджэнні клуба, дапамагаюць парадамі пачаткоўцам. З рэдактурай зборнікаў, арганізацыяй імпрэз дапамагае Юрась Нераток, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

***— Сябрамі клуба «Жывіца» з'яўляюцца не толькі паэты, але і кампазітары. Ведаю, што вы арганізоўваеце літаратурна-музычныя вечары, прымаеце ўдзел у розных конкурсах і фестывалях.***

— Так. Зладзіць мерапрыемства, арганізаваць выдатную канцэртную праграму мы гатовыя літаральна ў любы момант. Адметна, што канцэрты «Жывіцы» праходзяць на сцэне без рэпетыцый: усе выступоўцы прыязджаюць з розных мясцін, і напярэдадні імпрэзы іх проста немагчыма сабраць разам. Але як рэжысёр я выдатна бачу агульную карціну выступлення, і, ведаючы рэпертуар і здольнасці кожнага з сяброў клуба, магу выстраіць канцэрт. Адметна, што на абласным фестывалі-конкурсе «Напеў зямлі маёй», які штогод праходзіць на радзіме кампазітара Ігара Лучанка і ў якім прымаюць удзел толькі народныя і ўзорныя калектывы Міншчыны, мы сёлета паказвалі асобную канцэртную праграму.

**Часам кампазітарскае хобі сяброў нашага клуба перарастае ў прафесіяналізм. Іх песні гучаць на сцэне ў выкананні маладых артыстаў, на «Славянскім базары» ў Віцебску, свяце паэзіі і песні ў Маладзечне.**

***— А наколькі высокі прафесійны ўзровень кампазітараў — сяброў клуба?***

— Яны не прафесіяналы, але ў многіх з іх хобі ператвараецца ў прафесіяналізм. Іх песні і сёння гучаць на сцэне ў выкананні маладых артыстаў, на «Славянскім базары» ў Віцебску, свяце паэзіі і песні ў Маладзечне. Напрыклад, некалькі выдатных і плённых праектаў было ў кампазітаркі Алены Атрашкевіч і паэта з Крупак Барыса Макарэвіча. Алег Пяткун з Дзяржынска свае песні прапаноўвае для эстраднага аддзялення каледжа мастацтваў. Ён сам піша музыку і аранжыроўкі. Ёсць у нас аўтары-выканаўцы, якія пішуць і вершы, і музыку — як Максім Жыроні з Салігорска. Ён урач-педыятр, загадчык аддзялення неанаталогіі. Высокі, моцны мужчына, але піша такія выдатныя песні — з гумарам, вобразныя. Ці Уладзімір Цанунін, ён перажыў чарнобыльскую катастрофу, нават напісаў пра гэта цэлую кнігу паэзіі. Піша таксама і рознажанравыя песні. Я магу пералічыць яшчэ шмат таленавітых кампазітараў «Жывіцы», і менавіта дзякуючы дапамозе прафесіяналаў яны растуць у творчым плане.

***— Вы так разрэкламавалі «Жывіцу»! Як стаць сябрам клуба?***

— Проста прыходзьце. Нашы дзверы заўсёды адчынены. Адзінае, што варта памятаць: гэта абласны клуб і мы аддаём перавагу менавіта ўдзельнікам з Мінскай вобласці. Але і многія мінчане просяцца на пасяджэнні суполкі, кажуць, што толькі ў нас ёсць такая школа творчасці. Настойліва ходзяць да нас на пасяджэнні цягам некалькіх гадоў, працуюць. Натуральна, калі мы бачым інтарэс, жаданне, то не адкідваем удзельнікаў і прымаем у клуб ■

Матэрыялы паласы падрыхтавала
Марына ВЕСЯЛУХА. vesialuha@zviazda.by



■ Прэм'ера

# ЯБЛЫЧНЫ ДЖЭМ. З ВЯРШКАМІ І ЦУКРАМ

## Амерыканскі рэцэпт паспяховага дэсерту рэалізаваны на беларускай тэатральнай сцэне

Якія розныя людзі навокал! Але такія добрыя. У асноўным. Добрыя жабракі і прастытуткі, а якія жулікі — проста душэўныя людзі. Не, у нас дык іх наогул і быць не можа. А вось там, дзе ёсць, — на гнілым Захадзе — менавіта ў тых, хто «прыніжаны і пакрыўджаны», можна знайсці разуменне, спагаду, клопат і рэальную дапамогу. Як гэта здарылася з вулічнай гандляркай яблыкамі Эні, маргінальнай ва ўсіх адносінах асобай, якая жыла калісьці ў раскошы, але апынулася на мяжы выжывання. Апусцілася так, што баіцца ў лістах у Еўропу да роднай дачкі прызнацца ў гэтым. Але праўда павінна выплысць на паверхню: дачка Луіза вяртаецца дамоў пасля дванаццаці гадоў адсутнасці з жаніхом і яго татам, сапраўдным іспанскім арыстакратам, які жадае ўпэўніцца ў высокім паходжанні нявесты. Ад такіх навін — толькі ў пятлю, каб не цярпець ганьбы. Але з'яўляецца цудоўны чалавек, вынаходлівы жулік і рызыкоўны мафіёзі Дэйв...

У новай пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Горкага «Лэдзі на дзень» амаль усе героі — цудоўныя амерыканскія людзі, якія адстойваюць найвышэйшую справядлівасць роўнасці ў правах усіх, хто б у якой сям'і ні нарадзіўся, у якіх бы абставінах ні існаваў. Але такія могуць жыць не толькі ў Амерыцы. Рэальных людзей з рэальнымі праблемамі вельмі любіць паказваць Дзмітрый Астрахан, найперш у кіно. Гэта, напэўна, любімы кінарэжысёр слязлівых жанчын постсавецкай прасторы, дзе глядзяць расійскія тэлеканалы. Таму што, гледзячы яго фільмы, за героямі можна ўволю паперажываць (і паплакаць), але ў выніку «ўсё будзе добра». Нават фільм у яго такі ёсць. А асабліва народ памятае тэлемеладраму «Зала чакання», якая падчас паказу забяспечвала тэлеканалу вар'яцкі рэйтынг. У Дзмітрыя Астрахана ёсць імідж рэжысёра, які можа расчуліць. І ёсць у яго фільм «Лэдзі на дзень», ідэю якога аўтары падгледзелі ў Галівудзе. Там карціна «Лэдзі на адзін дзень» з'явілася ў 1933 годзе. Класіку Галівуда ў нас цяпер не часта паказваюць па ТБ. Можна і нагадаць, стварыўшы сваю версію.

Дзмітрый Астрахан пайшоў далей. Ён зрабіў не толькі фільм, але і версію для тэатра. Ян чакаў прадказальны поспех: спектакль быў пастаўлены ў Маскве, праходзіў пры аншлагах. Ведае рэжысёр шлях да сэрца гледачоў. Умее прыгатаваць страву, якая ў афішы будзе нібыта дэсерт у меню для аматараў салодкага і вельмі салодкага. Дапамог яму ў гэтым Алег Данілаў, які са звыклай ролі аўтара сцэнарыя фільмаў стаў аўтарам п'есы для тэатра. Але героі п'есы ўсё тыя ж, што ў галівудскай меладраме, з такімі ж характарамі, з тымі ж імёнамі. З тым жа Бруклінскім мастом, які ўмудрыўся прадаць Дэйв. З палісменамі і ганарлівымі рэпарцёрамі. З надпісамі па-англійску, ну каб зусім не было сумнення, дзе такое можа адбывацца.

Вось і ў нас няма сумнення. На сцэне не што іншае, як амерыканская рэчаіснасць пачатку XX стагоддзя. Бардэль з дзеўкамі ў панчохах, адна з якіх — мама таго самага кемлівага прыгажуна Дэйва. Менавіта ён і прыдумляе інтрыгу, як выдаць «яблычную Эні» за арыстакратку. Прастытуткі шляхам простага марафету пераўтвараюць яе ў лэдзі. У гатэлі (сябра Дэйва з'ехаў на нейкі час), дзе Эні прымае дачку з жаніхом і яго татам, ні ў каго сумнення няма ў яе высакароднасці. Засталося сабраць бамонд, каб гэты іспанскі свёкар супакоіўся... Жабракі і прастытуткі Амерыкі, плюс яшчэ мэр (яму неабыякавы гонар краіны) робяць справу так, што сумненні могуць быць у гонары самога іспанскага графа Альфонса Рамэра...

А я б сказала: насамрэч гэта нашы людзі непераможныя ў любові да тэатра — любога. Яны гатовыя ўжывацца і рэагаваць на простыя жарты і жартаўлівыя прыёмы ад рэжысёра. Яны гатовыя да таго, што рэчы будуць называцца сваімі імёнамі, і паказвацца, як ёсць, гатовыя стрываць любую пошласць, абы забаўна. Бруклін — значыць, Бруклін. Бардэль — каб адразу было відаць. Мафіёзі — белы касцюмчык. Арыстакрат — смокінг, нават пры сыходзе з трапа парахода. І гэтак далей.

Але нашага загартаванага гледача цяжка стаміць прамалінейнасцю падачы ў рэжысуры і сцэнаграфіі. Яго немагчыма збянтэжыць гісторыяй, якую трэба глядзець, абсалютна абстрагуючыся ад свайго жыцця — толькі таго і трэба. Пра чужое, далёкае, ды яшчэ амаль казачнае (жабрачка выдала дачку за арыстакрата!) можна глядзець з задавальненнем, асабліва для таго, каб падсілкавацца верай у чароўныя магчымасці, якія жыццё падкідвае само. Мала таго, такія спектаклі дазваляюць адключыцца ад штодзённых побытавых сітуацый (думаць і разважаць над імі — апошняе, чым можна «загружаць» нармальнага гледача). Звычайны прынцып «мыльных опер», дарэчы. Цяпер рэалізаваны яшчэ і ў тэатры, які з-за непасрэднага «жывога» выхаду да гледача імкнуўся гаварыць заўсёды пра самае набалелае і трапяткое. Шчасце дачкі — вось што трапяткое. Глядацкая чысціня і наіўнасць — ратаванне для рэжысёра. Таму што ўсё цудоўна і геніяльна, калі добры фінал. Добрага зашмат не бывае. І калі ў самым фінале на паклоне вулічная гандлярка яблыкамі (зноў) Эні чарговы раз чакае параход з сям'ёй Луізы, якая выходзіць з немаўлём у калысцы і на... апошніх месяцах цяжарнасці — гэта апагей майстэрства рэжысёра, які сапраўды знаўца чалавечых душ. Нам так мала трэба для шчасця — ведаць, што яно бывае. Хоць бы ў тэатры. Ці яшчэ недзе далёка. Калі не пакаштаваць — дык хаця б рэцэпцік...

Поўны Галівуд на сцэне. Думак няма, адны эмоцыі. Пасля спектакля — зашкальвалі: аншлаг. Глядацкае мастацтва перамагае само мастацтва.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*



■ На вялікім экране

# ЭСТЭТЫКА ПЕРАВАРОТУ

## Шэсць фільмаў і шэсць імёнаў французскай «новай хвалі» ў рэтраспектыве ў Мінску

**Чарговы раз успамінаецца жарт «нічога не адбываецца, як у французскім кіно» і чарговы раз яго хочацца абвергнуць. Насамрэч адбываецца, прычым глабальнае, непапраўнае, незваротнае — змена эпох, сацыяльныя зрухі пад уздзеяннем вайны ці злом чалавечай душы. Парадокс у тым, што ўсё гэта застаецца на фоне, амаль незаўважным, паказаным паўтонам, паўшэптам, намёкамі. Трэба толькі разгадаць і адкрыць. Як у фільме «Жуль і Джым» Франсуа Труфо — адной з найлепшых карцін французскай «новай хвалі», французскага кіно, сусветнага кінематографа. Разам з іншымі прадстаўнікамі «новай хвалі» яна будзе паказана ў Мінску на спецыяльнай рэтраспектыве, падрыхтаванай праектам CINEMASCOPE з дапамогай Пасольства Францыі ў Беларусі.**

Сусветнаму кінематографу ўжо 120 гадоў. Альбо толькі 120 — для мастацтва гэта не шмат, калі для параўнання побач з фільмамі братоў Люм'ер паставіць наскальныя малюнкі (жывапіс), творчасць Гамера і Гесіёда (паэзія), музыку і танцы, што пачыналіся ці не з Адама і Евы. Альбо з самых багоў. Нягледзячы на параўнальна малады ўзрост кінематограф — захаплялы аб'ект для даследавання. Штучны від творчасці, створаны ўжо не багамі, а ўласна чалавекам, поўны кірункаў для вывучэння, кантрастаў і феноменаў. Адным з гэтых феноменаў з'яўляецца французская «новая хваля», якая з адмераных 120 гадоў заняла каля шасці (пачынаючы з 1958-1959), але на сусветны кінематограф паўплывала неацэнна.

Менавіта ў гэтай краіне ў гэты час адзін з ключавых эпізодаў сусветнага кінематографа стварылі якраз гэтыя аўтары — Жан-Люк Гадар, Франсуа Труфо, Эрык Рамэр, Клод Шаброль, Ален Рэнэ, Аньес Варда і іншыя. Былыя дакументалісты, прыхільнікі сінема-верытэ (праўдзівасці на экране), журналісты і кінакрытыкі, шчыра закаханыя ў кіно шукальнікі новай кінамовы, сапраўдныя сінефілы, «нагледжаныя»


«Мая ноч у Мод».

прынцыповыя эстэты. За шэсць гадоў яны зрабілі пераварот у кінематографе, сённяшні вобраз якога з яго Джымам Джармушам, Ксаўе Даланам, Франсуа Азонам быў бы, магчыма, не такім багатым.

Рэтраспектыва прымеркавана да выхаду першага рускага выдання кнігі Антуана дэ Бека «Новая хваля: партрэт маладосці», выдадзенай у маскоўскім выдавецтве Rosebud Publishing (усё, што маркіруецца эмблемай гэтага выдавецтва, прыйдзецца даспадобы кінаманам і прафесіяналам кіно). 19 сакавіка ў Мінску кнігу прэзентуе кіназнаўца і галоўны рэдактар Rosebud Publishing Віктар Зацэпін. Прэзентацыя і шэсць кінапаказаў праграмы пройдуць у кінатэатры «Ракета», і пачатак будзе пакладзены 18 сакавіка дэманстрацыяй першай поўнаметражнай карціны Луі Маля — абсурдната нуара «Ліфт на эшафот».


«Жанчына ёсць жанчына».

Па сюжэце Жульен Тавернье плануе ідэальнае забойства мужа каханай Фларанс (якую сыграла Жанна Маро). Герой рэалізуе свой дасканалы план, але ў дзеянне ўмешваецца алагічная выпадковасць — сыходзячы, вахцёр адключае святло, і Жульен на ўсю ноч застаецца ў ліфце. Апроч гэтай яшчэ шэраг падзей развальвае ідэальна зладжаны план Тавернье і з «шэдэўра» робіць яго сурапцыдзеласць.

Згадка французскай «новай хвалі» не можа абысціся без імя Жан-Люка Гадара, які пачынаў свае прафесійныя стасункі з кіно ў парыжскім часопісе Cahiers du Cinéma, што і сёння застаецца аўтарытэтным сінефільскім выданнем. А Гадар застаецца таленавітым і вельмі працаздольным рэжысёрам (сёння яму 85 гадоў) — яшчэ нядаўна, у 2014 годзе, яго карціна «Бывай, мова» была паказана ў асноўнай конкурснай праграме Канскага кінафестывалю (атрымала прыз журы) і згадвалася ў разнастайных топах і спісах найлепшых фільмаў года. Стужку Гадара «Жанчына ёсць жанчына» з Жан-Клодам Брыялі, Аннай Карынай і Жан-Полем Бельмандо пакажуць у «Ракеце» 19 сакавіка.

20 сакавіка пройдзе паказ фільма Алена Рэнэ «Хірасіма, мая любоў» з Эмануэль Рыва ў галоўнай ролі, якая сыграла саму сябе — французскую актрысу. Па сюжэце тая прыязджае ў пасляваенную Хірасіму для здымак у фільме і сустракае архітэктара. Гэта гісторыя кароткага і вельмі дзіўнага кахання, дзе абое пакалечаны катастрофамі і цяжкімі ўспамінамі былых катастроф. 26 сакавіка адбудзецца паказ карціны Клода Шаброля «Прыгажун Серж», дзе Серж з'яўляецца некалі паспяховы архітэктар, што жыве ў правінцыйным французскім гарадку і ў сваім жыцці аддае перавагу алкаголю.

**Мінулае і сучаснасць сусветнага кінематографа нікуды без французскай «новай хвалі», але яна цікавіць нас не толькі як знакавы эпізод у гісторыі кінематографа, але і як крыніца, што можа задаволіць уласныя шуканні.**

Фільм, які трэба, на мой погляд, убачыць абавязкова, будзе паказаны апошнім, 27 сакавіка. Цудоўны акцёрскі тандэм — Жан-Луі Трэнціньян і Франсуаза Фабіян — сыгралі ў карціне Эрыка Рамэра «Мая ноч у Мод». Нягледзячы на тое, што магія гэтага фільма застаецца для мяне неразгаданым інтэгралам, адмовіць яго матэрыі ў чароўнасці немагчыма. Цягучая, атмасферная чорна-белая стужка наўрад ці дазволіць адарвацца ад экрана.

Увогуле французская «новая хваля» — гэта не тое каб заканамерны, але справядлівы ход развіцця гісторыі кіно. Францыя, перадавая кінадзяржава ў час станаўлення кінематографа, страціла свае пазіцыі з-за падзей Першай сусветнай вайны і саступіла першынство ЗША. Таму французскае кіно канца 1950-1960-х гадоў — гэта элегантнае і ўпэўненае навёрстванне ўпушчанага ў кірунку менавіта мастацтва, эстэтыкі кіно, а не яго індустрыі. Але і адносна Галівуда рэжысёры «новай хвалі» аддавалі належнае вядомаму віртуозу саспенсу Альфрэду Хічкоку і жанру нуара, што вызначыўся выкарыстаннем магчымасцяў кіно для тонкай перадачы сэнсу, паўцуццяў, атмасферы.

Прыхільнікі Квенціна Таранціна (а гэты рэжысёр, бясспрэчна, даспадобы аматарам як масавага, так і аўтарскага кіно) таксама павінны звярнуць увагу на «новую хвалю», бо менавіта ў ёй той шукаў натхнення. Свой дэбют «Шалёныя сабакі» Таранціна прысвяціў Жан-Люку Гадару (не лічачы вялікай колькасці адсылак да фільмаў французскага класіка), а фільм «Забіць Біла» ўвогуле стаў абсалютным амажам стужцы Франсуа Труфо «Нявеста была ў чорным».


«Жуль і Джым».

Мінулае і сучаснасць сусветнага кінематографа нікуды без французскай «новай хвалі», але яна цікавіць нас не толькі як знакавы эпізод у гісторыі, але і як крыніца, што можа задаволіць уласныя пошукі. Фільмы будуць дэманстравацца на мове арыгінала з рускімі субтытрамі.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*



# ЗЯМНЫ ВАНДРОЎНІК

## Колькі слоў

*Не спускай ты мяне на зямлю —*
*Я заземлены зроду глыбока.*
*Я радзіму так моцна люблю,*
*Што не трэба ніякіх зарокаў.*

### ВЯЛІКІ СВЕТ МАЛЕНСТВА

Ужо амаль пяць гадоў яго няма з намі. 14 сакавіка П. Місько споўнілася б 85 гадоў. Цяжка пісаць пра бацьку як пра пісьменніка. Для цябе ж ён проста бацька. Ты ж памятаеш, як ён браў у лес, вазіў на мора... Яго прафесія не здавалася табе незвычайнай.

З ранняга дзяцінства згадваецца, якія забаўныя і разнастайныя цені ён умеў паказваць рукамі на сцяне. Вырэзваў, не адрываючы *нажанак*, з паперы нейкія неверагодныя канструкцыі. Паказваў з-за спінкі крэсла лялечны тэатр: і бульбіны з моркаўкамі размаўлялі, і рукавічкі, і лялечныя галовы на пальцах, і проста рукі. Пра што былі «спектаклі»? Пра ўсё. І казкі, і павучальныя гісторыі — фактычна бацька сам стаў правобразам дзядзькі Лявона з «Навасёлаў». У яго нават была кніга пра лялечны тэатр. Аказваецца, пасля школы ён думаў спачатку паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут, а калі закончыў журналісцкае аддзяленне філфака БДУ і працаваў у Давыд-Гарадку ў раёнцы, кіраваў драмгуртком мясцовага Дома культуры. Трэба сказаць, што такое выхаванне дапамагло мне гадаваць і сваіх дзяцей: часта тое, што яны «не чулі» з маіх вуснаў, цудоўна засвойвалі ад пальчатачнага Невядомскага (так я называла Нязнайку, ляльку, якую калісьці прывёз з камандзіроўкі бацька).

Так сталася, што найбольшай папулярнасцю карыстаюцца дзіцячыя кнігі Паўла Місько. Гэта нездарма, напэўна: бацька любіў дзяцей, асабліва малых (што не зусім характэрна для большасці мужчын), любіў адкрываць для іх усю разнастайнасць свету, назвы раслін, жывёл і птушак... Памятаю, як я абуралася, што мой маленькі сын падоўгу ляжыць на падлозе каля канапы, марудна засоўваючы пад яе палку і дастаючы. Мне здавалася, што такі занятак, мякка кажучы, не спрыяе развіццю дзіцяці. Але бацька мяне спыніў: «Ён жа не проста так рухае палкай, ён пры гэтым нешта ўяўляе». Прайшоў час, сын навучыўся гаварыць, і аказалася, што палка была цягніком, які заязджаў у тунэль і вяртаўся, і паміж ад'ездам і вяртаннем адбывалася цэлая гісторыя. Вось гэтая здольнасць разумець вялікі свет маленькага чалавечка і дапамагла напісаць такія цудоўныя кнігі.

Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што з падлеткамі такога паразумення не было. Даволі запальчывы, бацька з цяжкасцю пераносіў нашы ўзроставыя выбрыкі, а на ласку быў стрыманы. Напэўна, гэта ішло з бацькоўскай сям'і: *падшпаркі* там працавалі нароўні з дарослымі, ніхто іх не песціў. У вёсцы найперш выхоўваюць працай, уласным прыкладам. Таму недахоп цяпла з яго боку ў гэтым узросце мы кампенсавалі, перачытваючы дзіцячыя кнігі. Безліч разоў чыталі іх і мае дзеці (дагэтуль, варта пакласці навідавоку «Прыгоды Бульбобаў» ці «Прыйдзі, дзень-залацень», як хвілін праз 15 знойдзеш сына ці дачку з усунутым у кнігу носам).

***

Творчая жылка перадалася яму ад абаіх бацькоў. Баба Ганна была цудоўнай казачніцай. Дзед Андрэй мог зрабіць рукамі усё на свеце, вынаходзіў розныя прыстасаванні, цацкі вырэзваў на вокны, самаробную мэблю. У маладосці іграў на гармоніку, зрабіў дзецям балалайку, але ніхто не зацікавіўся. З чацвярых дзяцей, якія выжылі (усяго было васьмёра), Павел стаў пісьменнікам, а Іван, усё жыццё працуючы ў калгасе, самастойна ў сталыя гады аваладаў акардэонам, быў цудоўным мастаком-самавукам (памятаю, усё стараўся падабраць правільныя фарбы, каб перадаць колер серабрыста-зялёнага лісця вярбы).

Адзін з меншых хлопцаў у сям'і, бацька навучыўся прасці і вязаць: яго часам пакідалі з жанкамі, што прыходзілі на попрадкі, калі дзед і старэйшыя браты ішлі на больш цяжкую работу. Увогуле яго адзінага з братоў зацікавіла рукадзелле (праз шмат гадоў ён звязаў першай унучцы шкарпэтачкі. Навучыўся па падручніку для ПТВ плесці паясы ў дзвюх тэхніках, наплёў усёй сям'і рознакаляровых закладак з мулінэ. Мог шыдзэлкам звязаць вераўчаныя лапці). Са смакам апісаў бяленне палотнаў, удзел у ім дзяцей у рамане «Хлопцы, чые вы будзеце...» («Не



З Васілём Віткам. 04.07.1987.

работа — свята, урачысты абрад... Светла помніцца, скрабе душу шчымлівасць...»). Крытыкі абвінавачвалі яго ў залішнім «бытавізме», але дзе цяпер убачыш і ў каго папытаеш падрабязнасці традыцыйнай сялянскай працы, якія ён з любоўю апісаў у сваіх творах?

Дзед Андрэй быў *сіберны* на работу і нікому спуску не даваў. Рабіў дзецям малыя (але не цацачныя) інструменты, каб дапамагалі змалку. Цэп, каса, граблі адпаведна росту. Касіць бацька мусіў пачаць гадоў у дзесяць, магчыма, таму і вырас ніжэйшым за братоў. Дзеда ў 1942-м параніў паліцай, даволі доўга ён ачуньваў. Пасля вызвалення Случчыны старэйшага брата і бацьку прызвалі ў войска, другога брата — у 1944-м. Пэўны час Паўлік заставаўся адзіным памочнікам маці (было яшчэ двое малых — брат, які памёр праз год пасля Перамогі, і сястра, што нарадзілася ў 1941-м). Аповесці «Чырвонае неба», «Гусі мае, лебедзі...» адлюстроўваюць атмасферу ваеннага дзяцінства.

***

Любоў да прыроды перадалася бацьку ад любімага дзеда Лукаша (Лукаш у «Калодзежы», дзяды ў аповесцях «Зямля ў нас такая», «Поезд ішоў на захад», баба Вера ў «Ласіных пацерках» маюць яго рысы). Бацькі былі вечна занятыя, а дзед, які так і не ўступіў у калгас, мог кінуць работу і пайсці ў лес ці на рэчку. Лес Востраў, куды яны хадзілі разам, фігуруе ў «Моры Герадота» і іншых творах. Бацька быў заўзятым грыбніком: збіраў ледзь не круглы год — ад вясенніх страчкоў да змерзлых, як шкло, сінюх позняй восенню. Дзяцей браў з сабой у лес, ведаў мясціны, дзе якія грыбы растуць, ехалі мэтанакіравана. Машыны ён доўга не меў, мы ездзілі з іншымі «ціхімі паляўнічымі» — пісьменнікамі Алесем Савіцкім, Уладзімірам Дамашэвічам, Эрнэстам Ялугіным, перакладчыкам Пятром Стафановічам. Дагэтуль стаяць перад вачамі багатыя нерушы баравікоў, вясёлыя страчкі на маладых лесапасадках, карагоды радовак і мёртвы чорны лес трохметровых пнёў, пакрытых апенькамі... Свае грыбныя прыгоды П. Місько апісаў у нізцы апавяданняў «Ласіныя пацеркі», аповесці «Зямля ў нас такая» і інш. Грыбы не знаходзілі паратунку нават у парку Чалюскінцаў, калі мы жылі побач. Не ленаваўся кланяцца і ягадам — збіраў суніцы на палігонах пад Мінскам (раз нават у «палон» трапіў: затрымалі вайскоўцы, высвятлялі асобу, адпусцілі з паўмяшком грэчкі), чарніцы ў Лошы, журавіны, буякі, брусніцы, дзікі барбарыс... Памятаю, як сабраныя суніцы мераў шклянкай, высвятляў базарную цану і радаваўся («Я сёння зарабіў столькі-та»). Зёлкі збіраў. Заўсёды вяртаўся з букетам палявых ці лясных кветак для мамы і з букецікам ягад для дзяцей. З дома творчасці ў Каралішчавічах увесну прывозіў не толькі свежыя рукапісы, але і бярозавы сок. Часта браў і мяне туды на канікулах. Чароўным светам было для мяне гэтае месца, дзе ўпершыню адчула такую нясцерпную любоў да радзімы, што хацелася ўпасці ў траву на квітнеючым лузе і цалаваць нагрэтую сонцам зямлю.

...Спыніў грыбныя-ягадныя паляванні Чарнобыль.

***

Кажуць, рэдка бывае, каб у пісьменніка была такая разнастайная творчасць: проза і паэзія — і для дарослых, і для дзяцей; кнігі гумару і п'есы; фантастыка і сацрэалізм. А мне здаецца натуральным, калі журналіст пачынае з кніг нарысаў, дакументальнай аповесці, піша ў асноўным прозу, а калі нараджаюцца дзеці — з'яўляюцца і дзіцячыя кнігі. Да таго ж П. Місько памятаў сваё бяскніжнае дзяцінства, як нясцерпна (і пра што) тады хацелася чытаць. Вытокі «Навасёлаў» — у гродзенскім перыядзе жыцця сям'і (1959-1964), у кнізе апісаны некаторыя прыгоды маіх сястры і брата і іх сяброў. «Як на нашы імяніны...» змяшчае больш факты майго жыцця (нават нашы акварыумныя рыбкі і хамяк сталі героямі гэтай аповесці. Знайшло ў ёй адлюстраванне і тагачаснае захапленне бацькі кактусамі, першыя «дзеткамі» якіх падзяліўся з ім Васіль Сёмуха). «Дзень-залацень» быццам знарок напісаны для ўнучак. Для маіх дзяцей пераклаў «Канька-гарбунка» і Чукоўскага (праўда, атрымалася «паводле» — «Муха-весялуха», бо арыгінал палічыў надта жорсткім для сучасных дзяцей. «Змякчыў» нават сюжэт казкі пра Піліпку-сынка: у «Прыйдзі, дзень-залацень!» у печцы сасмажвацца не ведзьміна дачка, а толькі дрэнны пацук). Прыдумаў некалькі калыханак для ўнука Тамаша. Ён любіў пісаць для дзяцей, лічыў іх самымі ўдзячнымі чытачамі і самымі шчырымі крытыкамі...



З сям'ёй у Батанічным садзе. Злева направа: Павел Андрэевіч, дачка Тамара, дачка Марына, жонка Аляксандра Міхайлаўна, сын Віктар. 1968 год.

### ХЛЕБ ДЛЯ ДУШЫ

*Брат-пісьменнік!*
*Помні звышзадачу:*
*Хлеб — вось твор, найперш для душы.*
*Твор рабі, як хлеб, калі ж інакш —*
*Кінь пяро і болей не пішы!*

Ва ўспамінах «На покліч душы» бацька расказаў, з якімі цяжкасцямі прабіваўся ў вялікую літаратуру, пра сямнаццаць гадоў, аддадзеныя журналістыцы. Нават ад газетных фельетонаў да гумарэсак у «Вожыку» і зборнікаў сатыры і гумару шлях быў хоць лагічны, але цярністы і доўгі.

Павел Місько лічыў, «што літаратура робіцца валамі». Ён і сам быў такім «валом», і немала радкоў прысвяціў услаўленню «цягавітасці і ўпартасці сялян». Цягавітасцю сваёй ён абавязаны бацькам — дзед лічыўся стаханаўцам, бабуля атрымала ордэн «За працоўную адзнаку». Працэс напісання твора параўноўваў з ткацтвам («Роздум у раённым музеі»):

*...Ці тых ідэй выснову*
*Кладзём мы на аснову?*
*А мова, стыль, браток,*
*Хіба не той жа ўток?*
*Прыстукнуў бёрдам ты ледзь-ледзь,*
*Не загусціў свой выраб,*
*І не тканіна ўжо, а рэдзь,*
*Чытач выносіць вырак.*

У чым-чым, а ў «рэдзі» Паўла Місько абвінаваціць немагчыма. Яго проза — скарбніца народнай мовы. Нездарма ў тлумачальным слоўніку шмат цытат з яго твораў. Моўныя характарыстыкі герояў вельмі разнастайныя: ад мясцовых гаворак (над сталом заўжды стаялі ўсе магчымыя дыялектныя слоўнікі і ўласная картатэка слуцкіх слоў) да макаранічнай мовы. Нязмушанасць і натуральнасць мовы дазваляе забыць, што на пачатку творчага шляху аўтар змагаўся з газетнымі штампамі. Калі выйшаў руска-беларускі слоўнік фразеалагізмаў, ён дапісаў шмат дапаўненняў на палях. Перадаваў іх З. Санько, друкаваў падборку ў «ЛіМе».

Яго раманы падобны на хлеб — спажыўныя, грунтоўныя. «Градабой» фактычна — энцыклапедыя савецкай вёскі перыяду яе росквіту (канец 70-х), такой ужо не існуе (калі чытала першы раз, не магла і падумаць, што ўсё так зменіцца і гэты твор калісьці набудзе гістарычную каштоўнасць!). І ў гэтым «разгары застою» кіпяць шэкспіраўскія страсці трох пакаленняў адной сям'і.

***

Закончыўшы ўніверсітэт ў 1955-м, папрасіўся размеркаваць у глыбінку Палесся. Сямейнае жыццё пачыналася ў незнаёмым месцы з нуля: «Першыя ночы спалі, паслаўшы на падлогу адно паліто, а другім накрыўшыся». У Давыд-Гарадку нарадзіліся мае брат і сястра, там жа бацька пазнаёміўся з настаўнікам Ц.А.Ніколенкам, былым камісарам партызанскага атрада, і гэтая сустрэча паспрыяла ў будучыні нараджэнню двух раманаў — «Мора Герадота» і «Хлопцы, чые вы будзеце...». Праўда, украінца аўтар зрабіў Мікульскім са Случчыны, каб перадаць і свае ўражанні, сваё веданне вайны. Памятаю, як Ніколенка прыязджаў да нас у Мінск пасля выхаду «Мора Герадота», спяваў украінскія песні пастаўленым нізкім голасам (галоўны герой рамана таксама рыхтаваўся ў маладосці да опернай кар'еры).

На сваім вяселлі кінуўся запісваць песні Аляксаны, мамінай цёткі, увесь абрад запісаў. Праз 25 гадоў Аляксана ўвайшла пад сваім імем у раман «Градабой». На вобраз фальклярыста-этнографа Федзі, верагодна, натхніў Міхась Раманюк. Цудоўныя вечары са слайдамі на паддашку старой майстэрні Раманюка — адны з самых яркіх уражанняў майго дзяцінства. У 90-я бацька падтрымаў У. Бярберава ў стварэнні «Ліцвіноў» — так абрыдла савецкая інтэрпрэтацыя беларускага фальклору ў псеўданародных касцюмах на тагачаснай сцэне (паднімаў праблему ў «Градабоі»). Вельмі ж любіў ён традыцыйныя спевы, асабліва мужчынскія. Успамінаў з настальгіяй, як да вайны ў Старцавічах па вечарах мужчыны спявалі на вуліцы, паклаўшы адзін аднаму рукі на плечы (ёсць адпаведная сцэна ў той жа кнізе). У нас дома звычайна спявалі за агульнай работай, дык бацька хораша саліраваў «Сівага каня», «Чому ж я не сокіл».

Пісаў ад рукі ў сшытках А4 за светлым сталом, пакрытым дэрмацінам, потым перадрукоўваў на машынцы. У шуфлядках можна было, апроч рукапісаў, знайсці шмат цікавага: напрыклад, маленечкі плецены з рысавай саломкі кашалёк з разнастайнымі замежнымі манетамі — памяць пра Маскоўскі фестываль моладзі і студэнтаў 1957 года, куды бацька трапіў «ад маладых літаратараў Брэстчыны» і адкуль прывёз шмат уражанняў.

Памятаю, як зламалася пішучая машынка, вішнёвая «Масква», і мама трымала капіравальную стужку ў руках, нацягвала, калі ён друкаваў, пакуль не набылі новую. Калі пазней яна страціла магчымасць хадзіць з-за поліартрыту, то падсылала дзяцей паглядзець, колькі старонак бацька напісаў за дзень, як толькі ён выходзіў з кабінета: хвалявалася, ці добра пішацца.

Не ездзіў ніколі за мяжу СССР, каб не звязвацца з 1-м аддзелам. Але і пасля таго, як з'явілася магчымасць ездзіць свабодна, таксама не паехаў (не ведаю, у чым прычына — эмацыйны стан таго часу, ці зямля вабіла больш?). Сочы, Львоў, Вільня — крайнія пункты. Як Аляксандр Грын, пісаў пра замежжа, не быўшы. Патрэбныя звесткі браў з кніг, тэлеперадач; выпісваў украінскі «Всесвіт», «Вокруг света». Каб праўдападобна напісаць «Грот афаліны», яму хапіла ў Батумскім дэльфінарыі пагладзіць дэльфінаў. А калі чытаеш, здаецца, што аўтар кнігі — вопытны дайвер.

Адмаўляўся ад пасад. Скептычна ставіўся да прыўладных пісьменнікаў, якія пры жыцці выдавалі па некалькі збораў твораў.

У старым будынку «Мастацкай літаратуры» (каля Чырвонага касцёла) працаваў з курцамі ў адным пакоі, плюс нервовая работа з аўтарамі. Пасадзіў сэрца, ужо і пераезд у новае памяшканне, асабісты кабінет не дапамаглі. «Хуткія дапамогі» — два разы на тыдзень, перадынфарктны стан. У 1980-м кінуў службу, узяў творчы водпуск: думаў, адпачне паўгода перад тым, як стаць галоўным рэдактарам (як прапаноўвалі) выдавецтва «Юнацтва» (заснавана 2 студзеня 1981

# ПАВЕЛ МІСЬКО

## пра бацьку

года). Але так спадабалася займацца толькі творчасцю, што на службу болей не вяртаўся.

Да таго ж мамін стан пагоршыўся ў 80-м, пасля смерці бабулі, у 81-м пераехала ад нас старэйшая сястра з сям'ёй. Брат вучыўся ў Маскве. Мне было 15. Вялікая частка хатніх клопатаў легла на бацьку. Тым не менш у гэты перыяд былі напісаны «Грот афаліны», дзве кнігі «Хлопцаў...», тры кнігі гумару («Вясельны марафон», «Лекцыя з падвывам», «Развітальная гастроль»), дзіцячыя «Эрпіды на планеце Зямля», «Прыйдзі, дзень-залацень!», перакладзены «Мёртвыя душы» Гогаля. Неяк бацька прызнаўся мне і брату, што марыць пад канец жыцця напісаць кнігу паводле беларускіх казак. Мы пераглянуліся: «Навошта чакаць? Пішы зараз, пацешыш унучак!» У кнізе, якая атрымалася, зведзена ў адзін скразны сюжэт і перапрацавана мноства народных казак — у асноўным чарадзейных і пра жывёл. Напісаны рытмізаванай прозай, «Дзень-залацень» насычаны прымаўкамі, загадкамі, мудраслоўямі (шмат з іх — аўтарскія) і падзелены на зручныя гісторыі-казкі, каб чытаць дзецям па адной перад сном. Выйшла кніга ў 1993 годзе з цудоўнымі ілюстрацыямі, месцамі «перабудовачнымі» (у выявах чарцей угадваюцца аблічча тагачасных палітыкаў). Сёлета нарэшце выйшла перавыданне, праўда, мастак працаваў іншы.

...Выходзілі кнігі, на ашчаднай кніжцы збіраліся грошы (не ўмеў траціць, жыць шыкоўна — дома было толькі самае неабходнае; не ўмеў заводзіць «блату», а тады без гэтага нельга было нічога добрага купіць ці «дастаць», у выніку шмат назбіралася):

*Раз, праўда,*
*падалося,*
*Што нешта*
*завялося*
*На беднай маёй*
*ніўцы.*
*Ды зжаў не я —*
*шчасліўцы!*
*Мне ж грошай*
*кот наплакаў,*
*Я дулю меў без*
*маку.*



**З унукам Тамашом за збіраннем дроў для вогнішча. У лесе пад Мінскам. Май 2004 г.**

*...Чарнатой замалёўваю клеткі,*
*Мала дзён, за якія быў рад.*
*І ссыпаюцца чорныя кветкі*
*У Малевічаў чорны квадрат...*

Замест таго, каб знесці, як меркавалася, набыты ў роднай вёсцы пасля смерці мамы дом і пабудаваць новы, мусіў застацца ў старэнькай халупе («згарэлі» ж уклады). З энтузіязмам узяўся за гаспадарку (па паўгода стаў праводзіць у вёсцы), узімку пачаў плесці кошыкі — успомніў тое, чаму вучыў дзед Лукаш. Лазу нарыхтоўваў позна ўвосень, розных колераў — вішнёвую, зялёную, жоўтую, аранжавую, каб было прыгажэй. Калі кошыкі запаланілі дом, а сваякі і сябры былі шматкроць адораныя імі, бацька стаў прадаваць іх у падземным пераходзе каля ГУМа. Не запіў, не ўпаў у дэпрэсію — стаў выжываць, як селянін. Здаваў яблыкі, парэчкі, бульбу нарыхтоўшчыкам, назбіраў грошай на тое, каб падняць стагадовую хатку, абкласці яе цэглай, адрамантаваць. Зямля дапамагла перажыць усе страты, вылечыла ад стэнакардыі. Паступова пачаў зноў пісаць.

Грамадскія пертурбацыі выклікалі да жыцця грамадзянскую лірыку. Апошняе каханне — інтымную. Да 70-годдзя выйшла кніга вершаў «Ружовыя ліўні». Выдаў і за свой кошт дзве кнігі — раман у вершах «Пакуль зямлю мілуе сонца» (2005), дзе ёсць аўтабіяграфічныя моманты, і зборнік «Прыгавораны да жыцця» (2007), у які ўвайшло аднайменнае апавяданне, а таксама раней апублікаваныя ў часопісных варыянтах аповесці «Востраў Мёртвая галава» (1995), «Ніль адмірары, або Я выбіраю смерць» (1999) і «Зялёныя змеі» (2004). Калі апавяданне магло б быць напісана і 20 гадоў таму (ваенная тэма, хоць і з фантастычным элементам), то ў аповесцях цяжка пазнаць ранейшага Паўла Місько. Яны маглі быць напісаны толькі ў дзевяностых — пачатку двухтысячных як рэакцыя на заходнія «каштоўнасці», якія хлынулі да нас з экранаў і старонак друку, а таксама як вынік палітычных расчараванняў («Ніль адмірары»). «Зялёныя змеі» найбольш уражваюць напружаным сюжэтам. Табуяваная тэма — герой хоча перавезці астанкі бацькоў з заражанай зоны і на свой розум спрабуе вырашыць гэтую задачу. Тут і пачынаецца яго ўласны «градабой». У анатацыі да кнігі ў інтэрнэце я нездарма назвала гэты твор вострасюжэтным чарнобыльскім трылерам пра ўшанаванне продкаў. Зборнік атрымаўся разнастайны па складзе і сучасны (ён, на жаль, не знайшоў дарогі да чытача, бо не мог распаўсюджвацца звычайным шляхам, як кнігі, выдадзеныя ў дзяржаўных выдавецтвах, а на прэзентацыі і «прома-туры» ў бацькі ўжо не было здароўя). Крыўдна, што наклад, магчыма, найлепшай кнігі П. Місько ляжыць дома мёртвым грузам. Алесь Разанаў пасля прачытання «Прыгаворанага да жыцця» напісаў: «...Некалі мы разам працавалі ў «Мастацкай літаратуры», і ў параўнанні з тым колішнім, што тады пісаў «Мора Герадота», тут ён выяўляецца невядомым, і больш за тое — невядомае выяўляецца і ў ім самім. У штодзённы маштаб урываецца сіла іншага вымярэння, а ён самаадданa і пільна вядзе хроніку асабовага (і людскога) Армагедона».

### АПОШНІ ГРАДАБОЙ

Нішто ў жыцці не давалася бацьку лёгка. Напэўна, таму нярэдкі ў кнігах «градабой». Часта яго героі даведзены абставінамі да крайнасці, няшчасці сыплюцца, як град. Нават арыентаваны на падлеткаў «Грот афаліны» з гэтага пачынаецца.

Самы ж цяжкі, пераломны момант у яго жыцці — пачатак 90-х. Смерць жонкі (1991), страта набытку (1992), падзенне прэстыжу пісьменніцкай працы, немагчымасць зарабляць на жыццё творчасцю негатыўна паўплывалі на бацьку. Свет перавярнуўся, трэба было зноў думаць, як жыць, што і як пісаць. Лецішча ў нас ніколі не было з-за маміных праблем са здароўем, лес стаў недаступным з-за радыяцыі — здымаць стрэс не было як. Але ён ніколі не скардзіўся: ні раней, ні тады. Маляваў сабе каляндарыкі і закрэсліваў дні:






**«Не Швейк — Місько». Шарж Васіля Быкава, напэўна, натхнёны такім выглядам П.Місько на вайсковых зборах на Гродзеншчыне (крайні справа). 1962-я.**

Засталіся нявыдадзенымі кніга гумару і дзіцячая, пра сінявокае мышаня, чыставік якой прапаў перад ці падчас ліквідацыі выдавецтва «Юнацтва». Фрагмент «Сінявочкі» быў апублікаваны ў часопісе «Вясёлка» і нават атрымаў прэмію імя Васіля Віткі. Магчыма, недзе ў выдавецтвах ляжаць і іншыя рукапісы, пра якія я не ведаю (так вынікае з некаторых газетных публікацый). Хочацца верыць, што ўсе яго творы калі-небудзь убачаць свет.

*Мінаюць леты, мінаюць зімы,*
*Мінаем і мы з імі.*
*А дрэва жыцця зелянее вечна —*
*Справядліва і чалавечна.*

**Марына СІДАРОВІЧ (МІСЬКО).**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДАРУНАК СЕЙБІТАМ!»

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падарунак сейбітам!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 16 сакавіка па 30 чэрвеня 2016 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

### II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Набор палівальны Karcher (спіральны шланг з пісталетам 10 м) | 7 | 586 000 | 4 102 000 |
| 2 | Каркас цяпліцы (4*3*2 м) крок 100 см | 1 | 2 560 000 | 2 560 000 |
| 3 | 3. Сотавы полікарбанат «Б» ULTRAMARIN 4 мм Празрысты, 6 м | 3 | 480 000 | 1 440 000 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам!» складае 8 102 000 (Восем мільёнаў сто дзве тысячы) беларускіх рублёў.

### III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падарунак сейбітам!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на другі квартал ці першае паўгоддзе 2016 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 16 сакавіка па 13 красавіка 2016 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не радзей чым раз на тыдзень у перыяд з 15 сакавіка па 11 красавіка 2016 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адкапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 13 красавіка 2016 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

### IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам!» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчыца аддзела падпіскі і рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатолевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

### V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 14 красавіка 2016 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя пpасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным палівальным наборы.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — цяпліца (каркас цяпліцы і сотавы полікарбанат).

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 красавіка 2016 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 красавіка 2016 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

### VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2016 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2016 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2016 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы — палівальныя наборы — выдаюцца пераможцам у тэрмін па 30 чэрвеня 2016 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае. Суперпрыз — цяпліца — будзе ў тэрмін да 30 чэрвеня 2016 года дастаўлены па адрасе, які ўкажа пераможца.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 чэрвеня 2016 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

### VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2714 ад 10.03.2016 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

■ Ядзім сваё

# «З ТОЙ ЖА МУЧКІ, ДЫ НЕ ТЫЯ РУЧКІ»

## Карэспандэнты «Звязды» разам з экспертам пратэсціравалі, як у сталіцы праходзіў тыдзень беларускай кухні

**У справе папулярызацыі нацыянальнай кухні вельмі важныя якасць і дасведчанасць. Гэта мы і вырашылі праверыць, а дапамагчы папрасілі эксперта беларускай кухні, аўтарку кніг, тэле- і радыёвядучую Алену МІКУЛЬЧЫК.**



Пра сябе Алена Мікульчык кажа: «Я — фанатка, і я за беларускую кухню».

### Кручанікі ды з кісялём

На нашу авантуру спадарыня Алена адгукнулася імгненна, і патлумачыла гэта проста: «Я — фанатка, і я за беларускую кухню». З прапанавага пераліку ўстаноў грамадскага харчавання, якія прынялі ўдзел у тыдні беларускай кухні (а іх ажно 95!), мы спыніліся на трох. Выбіраць стараліся розныя па папулярнасці, узроўні, месцы знаходжання. У выніку вырашылі наведаць рэстаран «Васількі» ў гандлёвым цэнтры «Скала» на вуліцы Пятра Глебкі, «Радзівілаўскі» на Лесі Украінкі і «Аліва» на праспекце Незалежнасці.

Тыдзень беларускай кухні ў сталіцы праходзіў ужо дзявяты раз. Падчас яго наведвальнікам рэстарацый прапанавалі пяць страў: халадзец з хрэнам (кошт 45 000), салянка шляхецкая (35 000), бліны са смажаніной па-вясковаму (80 000), кручанікі са свініны з грэцкай кашай і грыбамі (90 000) і густы журавінавы кісель з узбітымі вяршкамі (за 25 000). Мы папрасілі Алену Мікульчык выказацца адносна прапанаваных прысмакаў.

— Журавінавы кісель з узбітымі вяршкамі з даданнем крухмалу пачалі рабіць напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Да гэтага часу кісялі рабілі толькі на аснове аўсянай цежы (працэджанага вадкага раствору аўсянай мукі ці шматкоў. — **Аўт.**). Каб прыгатаваць гэты дэсерт як мае быць, трэба асобна дабаўляць сок ягад, асобна жамерыны. Адвар робіцца з жамерын, працэджваецца, дабаўляецца крухмал, і толькі потым — сок. І ён не падвяргаецца тэрмічнай апрацоўцы — максімум 60 градусаў. Тады гэта вельмі смачна.

На наша здзіўленне, нават узбітыя вяршкі аказаліся не вынаходкай сучасных гаспадынь, «узброеных» міксерамі і блендарамі, а досыць састаражытным ласункам.

Адносна халадца спецыялістка не выказала сумненняў, што прыгатуюць яго паўсюль добра, праўда, удакладніла Алена Мікульчык, гэта ўсё ж агульнаславянская страва. А вось салянка шляхецкая выклікала ў нашага эксперта лёгкую ўсмешку.

**«Стравы прыгатаваны па адной тэхналогіі, з аднолькавых інгрэдыентаў, але іх якасць залежыць ад чалавечага фактару».**

— Тут шмат супярэчнасцяў, бо гэта страва расійскага паходжання, а ў беларусаў салянка была больш як запяканка, чым як суп. Ёсць дзве версіі паходжання такой назвы: першая ад слова «сялянка», гэта значыць, ужывалі яе ў асноўным сяляне, якія накідвалі ў яе ўсё, што было ў хаце. Другая версія — ад салёната: дадавалі ў салянку квашаную капусту, салёныя агуркі, кавалачкі мяса... Шляхецкім гэта складана назваць. Хоць чыста тэарэтычна так можа быць, таму што шляхта была розная.

Смажаніна з блінамі — страва і цяпер досыць распаўсюджаная. Таму нас больш зацікавілі кручанікі, якія яшчэ называлі завіванцамі ці зразамі. Ды і грэцкая каша з грыбамі — традыцыйная беларуская ежа. Таму мы вырашылі пакаштаваць у розных установах кручанікі і кісель.

Трэба адзначыць, што сутнасць тыдня беларускай кухні — у прыгатаванні адных і тых жа страў па адзінай рэцэптуры, тэхналогіі і аднолькавай цане незалежна ад тыпу і класа аб'екта. Здавалася б, якія тут могуць быць адрозненні? Аказалася — вельмі істотныя.

### Што прапануе народная кухня?

Найперш выпраўляемся ў «Васількі». На лагатыпе ўстановы пазначана, што тут пануе народная кухня. Заходзім і здзіўляемся: нідзе няма ні намёку на тыдзень беларускай кухні. Меню таксама звычайнае, з беларускага хіба дранікі па-вясковаму за 87 тысяч ды салянка за 44 тысячы. Запытваемся ў афіцыянткі, дзе ж акцыйнае меню? Аказваецца, мы не туды селі: у адным памяшканні месцяцца адразу тры кавярні, таму нам трэба перайсці за перагародку...

**Сутнасць тыдня беларускай кухні — у прыгатаванні адных і тых жа страў па адзінай рэцэптуры, тэхналогіі і аднолькавай цане незалежна ад тыпу і класа аб'екта.**

Там на сталах ляжаць прыгожыя ўлёткі з фотаздымкамі страў, якія інфармуюць пра тыдзень беларускай кухні (праўда, чамусьці на рускай мове). Заказваем кісель і кручанікі, заказ нам абяцаюць прынесці праз 10-15 хвілін. Пакуль Алена Мікульчык распавядае, што такі кісель рабілі толькі ў багатых дамах, праходзіць акурат каля пятнаццаці хвілін, і нам яго падаюць. Я здзіўляюся, чаму спачатку прынеслі дэсерт, а эксперт ужо па адным толькі пяшчотна-ружовым колеры выносіць вердыкт: страва прыгатавана няправільна.

— Адразу скажу, што вяршкі з балончыка, яны ненатуральныя. Падругое: колер не той, павінен быць больш яркі, насычаны. Гэта значыць, што ягады кіпяцілі. Але трэба глядзець, што напісана ў тэхналагічнай карце. Калі там напісана так гатаваць — то нічога не зробіш.

Пакаштавала — салодка, даволі смачна, добрая густая кансістэнцыя...

Тэхкарту на кісель нам не паказалі. Спачатку афіцыянтка паклікала адміністратара, тая заўважна напружылася, паабяцала ўдакладніць, а пасля паведаміла, што не мае права паказваць дакумент неўпаўнаважаным асобам. У той жа час яна запэўніла, што прыгатавана страва выключна паводле стандарту, а тэхкарту можна знайсці на сайце Міністэрства гандлю.

Яшчэ хвілін праз 15 прыносяць гарачую страву. Выглядае даволі прывабна: на вялікай талерцы акуратна сфармаваны цыліндр з кашы, пасыпаны нешматлікімі смажанымі грыбамі і зялёнай цыбуляй, а побач два сухенькія мясныя рулецікі з невядомай начынкай.

— Ежа як ежа, — усміхаецца эксперт.

Як на мой густ, дык атрымалася сухавата. Мяса (у якое быў загорнуты чарнасліў) разжаваць было складана. Але грубых памылак Алена Мікульчык не адзначыла.

### «Прасіце лыжкі: гэта можна есці!»

Далей накіроўваемся ў Вяснянку, у рэстаран пры гандлёвым цэнтры «Радзівілаўскі». Шчыра кажучы, я чакала ўбачыць нешта накшталт буфета. Але гэта аказаўся даволі прэтэнцыёзна аформлены рэстаран, праўда, абсалютна пусты: у другой палове буднага дня мы былі тут адзінымі кліентамі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Шляхецкая беларуская страва — кручанікі і грэчка з грыбамі.

На ўваходзе ў рэстаран убачылі афішу, якая апавяшчала пра тыдзень беларускай кухні. Адміністратар адразу прапанавала нам меню акцыі (без карцінак, чорна-белае, затое ў ім пазначаны састаў страў), а затым звычайнае меню.

У «Радзівілаўскім», у адрозненне ад «Васількоў», адразу падалі кручанікі (дарэчы, акрамя чарнасліва, яны былі фаршыраваныя яшчэ і яблыкам). Тут жа разнёсся пах свежай зялёнай цыбулі.

— Я ведаю, чаму тут водар ёсць, а ў «Васільках» не было: цыбулю парэзалі толькі што, а ў папярэдняй кавярні яна была падрыхтавана загадзя, — заўважае Алена Мікульчык.

У афармленні вялікіх адрозненняў не было, хіба што дабавілі ліст салаты ды пятрушкі. Але страва выглядала неяк больш па-дамашняму.

Ды і на смак аказалася такой жа. Здавалася, мы елі зусім іншую страву, чым у «Васільках». Каша добра звараная, не пашкадавалі грыбоў. Мяса крышачку мякчэйшае. Мы засталіся задаволеныя. А эксперт...

— Ёсць заўвагі. Пачну з кашы. Яна не сухая, з дастатковай колькасцю грыбоў. Завіванцы не ідэальныя, але ўжо лепшыя. Ёсць такая прымаўка: з той жа мучкі, ды не тыя ручкі. Стравы прыгатаваны па адной тэхналогіі, з аднолькавых інгрэдыентаў, але іх якасць залежыць ад чалавечага фактару, — гаворыць спадарыня Алена.

**Калі прыносяць кісель, нас чакае расчараванне: страва па кансістэнцыі больш нагадвае ваду, у якой плаваюць часцінкі ягад; яна светла-ружовага колеру, а падалі яе з... саломінкай.**

Неўзабаве прыносяць кісель, і тут уж нават мы заўважаем, што ён больш падобны на сапраўдны, чым «васількоўскі». Па-першае, насычаны журавінавы колер. Па-другое — вяршкі: густыя, тлустыя, яны раставалі літаральна на вачах.

— Сапраўдныя, — задаволена ўсміхнулася знаўца нацыянальнай кухні. — Прасіце лыжкі: гэта можна есці!



Вось так павінен выглядаць сапраўдны журавінавы кісель.

Пакаштавалі і мы. Вядома, вяршкі не параўнаць. Але ж і сам кісель! У ім ясна адчуваўся смак свежых ягад! Бадай, больш смачнага (да таго ж і карыснага!) дэсерту мне каштаваць не даводзілася. Шкада толькі, што ён знік са шкляначкі за лічаныя хвіліны — настолькі мы ім захапіліся...

Гэтым разам прасіць тэхкарту мы не сталі, а проста спыталі ў афіцыянта, як прыгатаваны кісель. Нам расказалі, што асобна дадавалі жамерыны і сок, але ягады да кіпення ўсё ж давілі.

### Тэхналагічная карта? Без праблем!

Прызнацца, кавярня «Аліва» напачатку была першай у нашым рэйтынгу паводле ўзроўню. Тут на дзвярах таксама вісіць апавяшчэнне пра тыдзень беларускай кухні, на століках стаяць меню акцыі без карцінак і інгрэдыентаў, і, як паўсюль, на рускай мове. Цікава, што салянка (не шляхецкая, звычайная) прысутнічае і ў штодзённым меню, праўда, ужо за 65 тысяч. Алена Мікульчык заўважае, што кошты акцыі для гэтай установы даволі танныя.

Мы заказваем усё той жа кісель і кручанікі, і калі прыносяць першы, нас чакае расчараванне: страва па кансістэнцыі больш нагадвае ваду, у якой плаваюць часцінкі ягад; яна светла-ружовага колеру, а падалі яе з... саломінкай. Казаць, што смак з мінулым кісялём непараўнальны, будзе залішнім.

Другую страву падалі зноў на вялікай талерцы, прысыпаўшы не цыбуляй, а крышаным кропам. Каша выглядала пышнай, як і грыбы (якія, дарэчы, багата было не толькі зверху, але і ўсярэдзіне). Мяса таксама на выгляд было зусім не перасушаным. Як аказалася, яно было самым мяккім і сакавітым, да таго ж у яго было загорнута шмат чарнасліву. Бадай, найлепшы варыянт кручанікаў з усіх, якія мы пакаштавалі.

Калі мы сыходзілі, адміністратар пацікавілася, ці ўсё нам спадабалася. Уважліва выслухала заўвагі, без пытанняў прынесла тэхналагічныя карты (якія, па словах Алены Мікульчык, аказаліся складзенымі абсалютна правільна) і паабяцала ўлічыць парады.

— У першым варыянце кісель пераварылі, дабавілі шмат крухмалу і мала журавін. У другім варыянце яго праварылі трошачкі і не пашкадавалі ягад. У трэцім варыянце пашкадавалі ўсяго. Мяса ў «Васільках» пераперчана, пачынаеш есці — як нешта кіслае, далёка не адразу здагадаешся, што гэта чарнасліў. У «Радзівілаўскім» мяса пасмажылі на старым тлушчы, гэта і сапсавала страву. А тут усё добра, — рэзюмавала эксперт.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# ШКОЛЬНЫ ПОДЫУМ

**Якія дызайнерскія знаходкі маюць права на прымяненне ў адзенні для школы, каб не парушыць школьны «дрэс-код»? Ці можна знайсці кампраміс паміж строгасцю і індывідуальнасцю? Наколькі апраўдана захапляцца фурнітурай і аксесуарамі ў дзявочых мадэлях? Як увогуле можна дагадзіць дзяўчатам-падлеткам? Адказы на гэтыя пытанні можна было знайсці падчас прэзентацыі новай калекцыі адзення дзелавога стылю для школьнікаў канцэрна «Беллегпрам», што адбылася ў рамках выставы «Свет дзяцінства — 2016».**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Стваральнікі калекцыі ЗАТ «Калінка» сцвярджаюць, што пры рабоце над дзявочым адзеннем улічылі ўсе модныя тэндэнцыі будучага сезона. Мадэлі (жакеты, камізэлькі, спадніцы, сарафаны, штаны) гарманічна дапоўнены дэталямі з тканін у клетку і палоску, а таксама трыкатажнымі палотнамі. Вырабы дэкарываваны аксамітавай тасьмой, строчкамі, якія імітуюць ручное шво, залатой металічнай фурнітурай і рамянямі кантраснага колеру. Камплекты, у якія ўваходзіць адразу некалькі адзінак адзення, страхуюць ад аднастайнасці і дазваляюць дзяўчатам карэкціраваць штодня свой дзелавы вобраз.

У калекцыі для дзяўчат ААТ «Славянка» знайшлося месца і карункам, і тасьме, што ўнесла «разыначку» ў строгі дзелавы стыль. У сваёй хлапчуковай калекцыі мадэльеры «Славянкі» зрабілі стаўку на прыталены сілуэт і завужаныя штаны — гэта адпавядае апошнім тэндэнцыям моды. Модныя мадэлі выкананы ў сінім колеры з полівіскознай тканіны, якая ўтрымлівае 35% віскозы. А натуральная лінія ад «Славянкі» прадстаўлена касцюмамі для хлопчыкаў і сарафанамі і касцюмамі для дзяўчат і пашытая з шарсцяных і паўшарсцяных тканін Мінскага камвольнага камбіната.

Лаканічнасць і мінімалізм, строгасць і какетства, камфорт і прыгажосць з'яўляюцца галоўнымі характарыстыкамі калекцыі ААТ «Знамя індустрыялізацыі». Рамантычныя натуры павінны ацаніць мадэлі з валанамі, фальбонамі і аздабленнем карункамі. Асаблівую ўвагу на прадпрыемстве надаюць якасці і камфортнасці, а таму выкарыстоўваць тканіны з высокім утрыманнем натуральных валокнаў.

Самыя разнастайныя фасоны джэмпераў, жакетаў, камізэлек, світараў і сарафанаў з паўшарсцяных і бавоўняна-нітронавых тканін прадставіла на суд маленькіх экспертаў ААТ «Палессе». Дыхтоўнасць, практычнасць, зручнасць, якасць і даступныя цэны — гэта менавіта тое, што робіць прадукцыю «Палесся» запатрабаванай у шырокага кола спажыўцоў.

Калекцыя адзення дзелавога стылю ад ААТ «Элод» спалучае модныя тэндэнцыі і традыцыйныя элементы класічнага школьнага касцюма. Усё адзенне лёгка спалучаецца паміж сабой, што аблягчае выбар дзецям і іх бацькам.

Калекцыя «Разумнікі і разумніцы» ад ААТ «БелКрэда» — гэта сучасны крой і высокая якасць выканання, якія забяспечваюць добрую пасадку. Для нестандартных фігур падлеткаў гэта асабліва важна. А ісці ў нагу з часам дапамагае выкарыстанне прыгожых і якасных сучасных тканін.



Яркую калекцыю адзення для заняткаў спортам прадставіла ААТ «Світанак». Палатно, якое спалучае паліэстар з эластанам, лепш за ўсё падыходзіць для спартыўнага адзення. Яно прыемнае навобмацак, не камячыцца, добра захоўвае форму і прапускае паветра, што дазваляе скуры дыхаць.

ААТ «8 сакавіка», у сваю чаргу, прадставіла спартыўную падлеткавую калекцыю «Рок-клаб». Універсальная і шматфункцыянальная капсула ўключае штаны, легінсы, сукенкі, спадніцы, футболкі, майкі і джэмперы, у якіх будзе зручна займацца спортам. Яркая, але ў той жа час мяккая колеравая гама, робяць калекцыю жаноцкай, свежай і дынамічнай. Агульны стыль калекцыі фарміруюць геаметрычныя прынты і модныя сілуэты.



* * *

Як расказала **прэс-сакратар канцэрна «Беллегпрам» Наталля КРАЎЦОВА**, сёлета беларускія прадпрыемствы імкнуліся ўлічыць усе пажаданні і крытычныя заўвагі бацькоў. Бо як бы ні заміlоўваліся гледачы на паказе малымі ў строгіх мужчынскіх касцюмах, аднак дастаткова толькі ўявіць сабе, як першакласнік будзе коўзацца ў ім кожны дзень, каб зразумець, што такое адзенне малапрыдатнае для штодзённага нашэння. Ва ўсялякім разе, у пачатковай школе. Галоўнае патрабаванне бацькоў — адзенне павінна быць адначасова і камфортным, і гігіенічным, і прэзентабельным. Яно не павінна камячыцца, даваць усадку пасля мыцця і хутка страчваць свой знешні выгляд.

Арганізацыі канцэрна «Беллегпрам» пазіцыянуюць сябе як вытворцаў тавараў для школьнікаў, якія клапоцяцца пра здароўе дзяцей. Пры распрацоўцы і вытворчасці новых калекцый выкарыстоўваюцца розныя інавацыі, улічваюцца папулярныя трэнды і кірункі сусветнай моды. Усяго ў вытворчасці тавараў для дзяцей школьнага ўзросту ў гэтым годзе будуць задзейнічаны 28 арганізацый канцэрна.

Яшчэ адзін кірунак працы — рэалізацыя пілотнага праекта «Школа будучыні». У бягучым навучальным годзе ім ахоплены больш як 700 школьнікаў з розных рэгіёнаў краіны. Ідэя аўтараў заключаецца ў тым, каб уніфікаваць адзенне дзелавога стылю для вучняў пачатковай школы і максімальна задзейнічаць пры гэтым патэнцыял айчынных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.

Але гэта зусім не азначае, што ўсе дзеці будуць апранутыя аднолькава. Нават у адной школе вучні розных класаў могуць выбіраць разам з бацькамі форму на свой густ. Галоўнае, што гэта будзе дзелавое адзенне, а выбар застанецца за навучальнымі ўстановамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ПЛАШЧ ЦІ ХАЛАТ?

## ТОП-6 ПАЛІТО І КУРТАК ГЭТАЙ ВЯСНЫ

**Увесну заўсёды хочацца перамен. І пачаць можна з гардэроба. На што змяніць цёплы пухавік, каб было стыльна, лёгка і ў той жа час камфортна? Модныя ў гэтым сезоне курткі і паліто мы падабралі разам з беларускім дызайнерам Анастасіяй ЛАРЫЁНАВАЙ. На заметку: усе мадэлі падыдуць пад любы стыль і ўзрост.**


**Паліто-кардыган ад Anastasiya Laryonova.**

### БОМБЕРЫ

Гэтыя курткі з поясам-рызінкай і манжэтамі, якія некалі ствараліся як спецадзенне для амерыканскіх пілотаў, вярнуліся ў нашу моду дзесьці 2-3 гады таму. Вельмі зручны варыянт. Насіць іх прапануюць абсалютна пад розныя вобразы: з пышнымі спадніцамі-пачкамі, олдскульнымі рэчамі ў клетку, з джынсамі-бойфрэндамі ці класічнымі.

— З вузкімі джынсамі аб'ёмны верх заўсёды глядзіцца крута, — падказвае Анастасія. — Такія мадэлі падыдуць актыўным жанчынам рознага ўзросту. Вельмі аб'ёмныя бомберы — толькі для худых дзяўчат.

### ПАЛІТО-КАРДЫГАНЫ

Прамыя паліто без падкладкі разлічаны на вясенне-летні перыяд. Для нашага надвор'я, з прахалоднымі летнімі вечарамі, — тое, што трэба. «Калі да паліто нейтральнага адцення падабраць лёгкі шыфонавы ці шаўковы шалік і туфлі-лодачкі, атрымаеце больш рамантычны і класічны вобраз. А ў камплекце з шалікам-снудам, шырокім поясам, красоўкамі ці чаравікамі грубай формы на платформе — ужо паўсядзённы варыянт для шпацыру па горадзе», — раіць дызайнер. Паліто-кардыган асабліва зручнае для дам, якія ездзяць за рулём, паколькі ў гэтым фасоне робяць рукаў тры чвэрці. Беларускія дызайнеры, дарэчы, шырока выкарыстоўваюць гэтую мадэль і прапануюць варыянты з прынтам у «гусіную лапку» ці «елачку».

### ОВЕРСАЙЗ

Паліто свабоднага крою (быццам бы на памер большае, чым трэба) — гэта ўжо амаль класіка. Той прыклад, калі мода можа быць утульнай. Адзіны мінус — «пышныя» дамы не вельмі ўдала ў ім глядзяцца. Калі вы носіце 48-ы памер і большы, паліто-оверсайз не варта апранаць, бо яно дадасць дадатковы аб'ём практычна па ўсім целе. Выключэнне — жанчыны высокага росту. А дамам з формамі лепш выбіраць маленькія паліто ці мадэлі з поясам на таліі.

### ТРЭНЧКОТ

Класічны варыянт плашча з водапранікальнай тканіны ці шчыльнай бавоўны, які ў модзе ўжо вельмі даўно. Ён практычна не змяняе сваёй формы: гэта двухбортная мадэль, з адкладзеным каўняром, манжэтамі, какеткамі і поясам.

— Думаю, ён мусіць быць у кожным гардэробе, — кажа Анастасія. — Прыгожа глядзіцца з укарочанымі штанамі і джынсамі. Пясочныя і балотныя адценні, у якіх звычайна адшываецца трэнчкот, заўсёды актуальныя. Нашы дызайнеры робяць яго ў аліўкавым тоне і колеры хакі. Вельмі выйгрышны варыянт. Лепш патрацiцца і купіць дарагое паліто з якаснай тканіны, якая не будзе выгараць, бо гэты фасон заўсёды застанецца ў трэндзе.

### ПАЛІТО-ХАЛАТ

Адразу папярэджваем: гэта не тое адзенне, у якім можна штодзень ездзіць у перапоўненым грамадскім транспарце. Паліто перавязваецца толькі поясам і нідзе больш не зашпільваецца, таму працікацца ў ім да дзвярэй праз натоўп пасажыраў не надта зручна. І глядзіце прагноз надвор'я перад выхадамі: у ветраны і халодны дзень лепш выбраць іншую мадэль, бо такі «халат» можа выпадкова расхінуцца. У іншых сітуацыях — калі ласка. Бо мадэль вельмі прыгожая і ўтульная, асабліва мяккія пледавыя варыянты, якія прадстаўлялі на сёлетніх подыумах.



**Бомбер. Брэнд Zibra.**

### КАСУХА

Скураная куртка пасуе ўсім. Пры выбары колеру лепш аддаць перавагу базавым — сіняму, карычневаму, бэжаваму. Спалучаць касуху можна ледзь не з любымі рэчамі з вашага гардэроба.

— Галоўнае, каб прадметы адзення не вельмі адрозніваліся па колеравай гаме і прыблізна былі ў адной стылістыцы. Куртка з грубай скуры і карункавая спадніца разам будуць глядзецца недарэчна. Хоць цяпер актыўна змешваецца ўсё, таму не бойцеся эксперыментаваць, — заўважае дызайнер.

Як варыянт, можна выбраць больш далікатную замшавую куртку. Але гэты матэрыял горш носіцца і ў месцах, дзе датыкаецца да сумкі, можа выглядаць няўдайна і лысавата. Таму такая мадэль не на кожны дзень: грошай на хімчыстку не набярэшся.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор аукциона – Прибытковский сельский исполнительный комитет Гомельского района Гомельской области**

| № п/п | Адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Размер земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена земельного участка, руб. | Размер задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Республика Беларусь, Гомельская область, Гомельский район, Прибытковский сельсовет, п. Цагельня, ул. Новая, У-15 321085603601000414 (лот №1) | Участок свободен от застройки. В радиусе менее 100 водопровод, газопровод, линия электропередач | 0,1398 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 193 381 100 | 19 338 100 | 8 205 850 + расходы на размещение информации в СМИ |

1. **Аукцион состоится 6 апреля 2016 года в 14.30 в административном здании Гомельского районного исполнительного комитета по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, малый зал (3 эт.)**

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при двух и более участниках, претендующих на участок.

Участнику необходимо подать заявление в Прибытковский сельский исполнительный комитет с указанием кадастрового номера земельного участка, который он желает приобрести в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Лица, желающие принять участие в аукционе к заявлению прилагают: квитанцию об оплате задатка (реквизиты платежа уточняются в бухгалтерии Прибытковского сельисполкома), а также предоставляют копию документа, содержащего их индикационные сведения, без нотариального засвидетельствования. Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность. При подаче документов на участие в аукционе представители гражданина предоставляют паспорт или иной документ удостоверяющий личность.

3. Заявления по участию в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гомельская область, Гомельский район, аг. Прибытки, ул. Ленина В.И., д. 68, кабинет №3 (т. 8 0232 934584). Последний день приема документов – **4 апреля 2016 года.**

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. При этом ему в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан подписать протокол аукциона, не позднее 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка, затраты на подготовку и проведение аукциона и опубликования настоящего изменения.

5. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

6. С порядком проведения аукциона можно ознакомиться в Прибытковском сельском исполкоме.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества:**

**здание административного корпуса, общ. пл. 2168,9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25,8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414,3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440,2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора** на земельном участке, площадью **3,1450 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;

**трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв.м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116,9 кв.м (инв. № 640/С-51797)** на земельном участке площадью **0,1960 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко;

**скважина № 8** (инв. № 640/С-27298) и **ограждение**.

Начальная цена с НДС – **4 527 717 800 бел. руб.** ***(стоимость снижена на 75%)***. **Задаток 10% от начальной цены (452 771 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). *Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 16.02.2016.* Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.03.2016 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.03.2016 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УСП «ПМК-7» ОАО «ПИНСКСОВХОЗСТРОЙ»

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Изолированное помещение (инв. №150/D10208), общ. пл. 118,8 м² – торговое помещение, наименование – магазин «Белая Русь» | 1 198 994 000 | 119 899 400 |
| **Местонахождение объекта** | Брестская область, г. Лунинец, ул. Советская, 4А-20 | | |
| **Продавец (Балансодержатель)** | УСП «ПМК-7» ОАО «ПИНСКСОВХОЗСТРОЙ» | | |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 | | |

**Аукцион состоится <u>14 апреля 2016 г. в 11.00</u> по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

**<u>Последний день приема заявлений</u> – 13 апреля 2016 г. до 17.00.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса, инв. №98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. №98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. №98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. №98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. №98340, инв. №98339, инв. №98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. №98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада-площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. №98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. №98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть, инв. №98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус, инв. №98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса, инв. №98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная, инв. №98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. №98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. №98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | **Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)** | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 66% и составляет без НДС 22 185 307 360 бел. руб.**

**Задаток 5% от начальной цены (1 109 265 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 29.12.2015.*

Аукцион состоится **29.03.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.03.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

**Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 426162**

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым №222150100001001905, площадью 0,0105 га по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. Докшицы, ул. Ленинская (территория рынка) для строительства и обслуживания торгового павильона по торговле мясом и мясными продуктами (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Начальная цена**: 7 821 700 бел. руб. **Размер задатка:** 782 000 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **13.04.2016 в 14.15** по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: **с 14.03.2016 с 8.30 по 12.04.2016 до 17.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** 3600317006602 в ЦБУ №209 филиала №216 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801648, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо признания аукциона аренды несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; заключить с Докшицким райисполкомом договор аренды зем. участка и в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка обратиться за гос. регистрацией права аренды на зем. участок, ограничений (обременений) прав на него; получить разрешение на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года; приступить к занятию зем. участка в течение 6 месяцев со дня утверждения проектной документации на строительство; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; по истечению срока аренды зем. участка с момента гос. регистрации совместно с Докшицким райисполкомом решить вопрос его дальнейшего использования. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. **Для участия в аукционе** граждане, индивидуальные предприниматели и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, предоставляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**Продавец: ОАО «Чаровница», 210039, г. Витебск, ул. П. Бровки, 20, (029) 711-51-34.**

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212)42-61-62**

| |
|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение с инв. №200/D-173782, площадью 476,3 кв. м, по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 20-11, назначение, наименование – административное помещение (земельный участок с кадастровым №240100000003000240 площадью 1,0097 га (долевая аренда)). Нач. цена: 1 496 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 149 600 000 бел. руб. Шаг аукциона – 74 800 000 бел. руб. |
| **Лот №2.** Изолированное помещение с инв. №200/D-173780, площадью 469,9 кв. м, по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 20-9, назначение, наименование – административное помещение (земельный участок с кадастровым №240100000003000240 площадью 1,0097 га (долевая аренда)). Нач. цена: 1 476 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 147 600 000 бел. руб. Шаг аукциона – 73 800 000 бел. руб. |
| **Лот №3.** Капитальное строение с инв. №200/С-50521, площадью 15,5 кв. м, по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 20, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – сторожевая, ворота металлические откатные на ж/б столбах дл. 8м, высотой 1,7 м; земельный участок с кадастровым №240100000003000240 площадью 1,0097 га (долевая аренда). Нач. цена: 44 400 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 440 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 220 000 бел. руб. |

